

СТАРТ
КАР'ЕРЫ
ДАЕ РЭЗЮМЕ
ЧЫРВОНКА

ЯК
ПАТРАПІЦЬ
НА ПОДЫУМ?
ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 САКАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 48 (28915)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый ДАРАГАКУПЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:**

*«Камісія хацела б вынесці праект новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса на разгляд на адкрыцці вясенняй сесіі, 2 красавіка. Чакаецца, што кодэкс уступіць у сілу да канца года. Нормы кодэкса ўдасканалены з улікам правапрымяняльнай практыкі, прыведзены ў адпаведнасць з нарматыўнымі прававымі актамі кіраўніка дзяржавы і іншымі заканадаўчымі актамі. У прыватнасці, у кодэксе прапісаны правы і абавязкі грамадзян, арганізацый-забудоўшчыкаў, а таксама арганізацый, якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі і якія эксплуатуюць жыллёвы фонд. Прадугледжана магчымасць пераводу арэнднага жылля, якое займаюць грамадзяне, што маюць права на атрыманне сацыяльнага жылля, але не знаходзяцца на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, у сацыяльнае жыллё».*

# КРЫНІЧНЫ ДАБРАДЗЕЙ



Вуліца Падгорная ў Докшыцах вядомая тым, што яна ідзе ўздоўж поймы Бярэзіны — менавіта тут пачынаецца славутая рака. А яшчэ і тым, што на вуліцы ўжо не адно стагоддзе прабіваецца іншая крыніца, на вадзе з якой яшчэ да вайны варылі знакаміты докшыцкі напой — піва гатунку экстра-класа. Пра гэта мне расказаў жыхар вуліцы — былы настаўнік фізікі і інфарматыкі васьмідзесяцігадовы Мікалай КІВА. Сорак гадоў Мікалай Сяргеевіч жыве каля гэтай крыніцы, даглядае яе, чысціць, рамантуе парэнчы і цэментуе прыступкі.

— Да крыніцы ходзіць не толькі ўся вуліца, прыязджаюць іншыя гараджане, таму месца павінна быць упарадкаваным, утульным, прыгожым, — кажа Мікалай Ківа і дадае, што некалі сын адвёз ваду ў сталіцу на аналіз і тым самым пацвердзіў, што яна ў крыніцы па-ранейшаму выключна чыстая.

Мікалай Сяргеевіч раіць піць гэтую ваду як мага часцей. Каб быць бадзёрым і не адчуваць сваіх гадоў, ён ужывае толькі гэты «эліксір здароўя». Але пенсіянеру хочацца, каб камунальныя службы горада нарэшце давялі справу па ўпарадкаванні тэрыторыі да канца, бо крынічны ставок пасля ачысткі стаў забалочвацца, вада ў ім не збіраецца, трэба над водаправодным люкам узвесці ахоўны навес — гэта будзе найлепшы падарунак помніку прыроды.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

***На фота:*** крынічны дабрадзей Мікалай КІВА і яго добразычлівая суседка Валянціна ХІЛЬКО.

## КОРАТКА

- **У жылфондзе Беларусі прапануюць прызначаць упаўнаважаных асоб па кіраванні агульнай маёмасцю.**
- Больш за 3 тысячы кітайскіх грамадзян вучацца ў Беларусі.



- **Зорка сусветнай поп-музыкі Энрыке Іглесіяс дасць у снежні ў Мінску вялікі сольны канцэрт.**
- Памер сагама буйнога зафіксаванага хабару ў Беларусі ў 2018 годзе склаў 85 тыс. еўра. Агульная сума канфіскаваных хабараў у 2018 годзе склала $544 тыс.

Праз адлегласць і час

# ДОЎГІ ШЛЯХ ЦУДАДЗЕЙНАГА ЛОТА

### У Гродна прывезлі ікону з антыкварнага аўкцыёна ў Германіі

**Гэта копія Каложскай іконы Божай Маці, якая напісана на пачатку XX стагоддзя. Тады сама цудадзейная ікона яшчэ не знікла. Кажучы працей, гэта «прыжыццёвы» партрэт старажытнага абраза. Яго вяртанне ў Каложскі храм называюць сапраўдным цудам.**



Фота БелТА.

**Аперацыя ўдалася**

Пасадзейнічалі гэтаму сучасныя тэхналогіі. Панамар храма Анатоль Калкоўскі доўгі час шукаў у інтэрнэце якую-небудзь інфармацыю аб сапраўднай Каложскай іконе Божай Маці. І ў канцы мінулага года нечакана ўбачыў выяву іконы на сайце па продажы антыкварыяту ў Германіі. На аўкцыёне, які быў прызначаны на найбліжэйшы час, сярод лотаў значыўся і лот Каложскай іконы. Уражаны такім фактам, Анатоль адразу паведаміў аб гэтым настаяцелю Свята-Барыса-Глебскай (Каложскай) царквы Аляксандру Балоннікаву.

СТАР. 13

Па звароце ў рэдакцыю

# СПРЭЧНЫ ПАВІЛЬЁН

### Што будзе з бясплатнымі гандлёвымі месцамі для пенсіянераў на рынку ва Уруччы?

**На сталічным рынку «Уручча-3» пенсіянеры, што гандлююць кветкамі і гароднінай, могуць застацца без даху над галавой. Павільён, дзе ім адведзены бясплатныя месцы, ужо некалькі месяцаў знаходзіцца пад пагрозай зносу. Ці ёсць шанцы яго захаваць? Атрымаўшы пісьмо ад чытачоў, «Звязда» накіравалася разбірацца.**

## «Працей усё знесці»

Пляцоўку для рэалізацыі сельгаспрадукцыі на рынку арганізавалі ў 2016 годзе, пасля таго, як скончыўся яго рамонт. Але не ўсе былі ёй задаволены: многія з прадаўцоў, якія прыходзяць туды з садавінай, гароднінай і кветкамі, — пенсіянеры, а таму палатак ці іншага гандлёвага абсталявання не маюць. Пажылыя людзі не раз прасілі адміністрацыю рынка стварыць для іх нармальныя ўмовы — хоць бы нейкі навес, каб не мокнуць пад дажджом і не стаяць пад пякучым сонцам. У выніку летась у красавіку для сезонных гандляроў усталявалі павільён — заводскай зборкі, без фундамента.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!**

**Працягваецца падпіска на II квартал 2019 года**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!**

Парламенцкі дзённік

# НА ПАРАДКУ ДНЯ — ПЫТАННІ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

**Шэраг законапраектаў сацыяльнага блока, што датычацца сістэмы аховы здароўя, будзе разгледжаны на вясенняй сесіі парламента, якая адкрыецца 2 красавіка. У прыватнасці, змены закрануць такія сферы, як трансплантацыя і дапаможныя рэпрадукцыйныя тэхналогіі, а таксама шлюб і сям'ю. Пра гэта расказала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валянціна КУРСЕВІЧ.**



Фота БелТА.

## Трансплантацыя: кола донараў пашырыцца

У лютым споўнілася 10 гадоў з першай трансплантацыі сэрца ў Беларусі. За гэта дзесяцігоддзе айчынныя трансплантолагі занялі лідарскія пазіцыі на постсавецкай прасторы па колькасці перасадак і ўвайшлі ў дзясятку найлепшых у свеце па трансплантацыі сэрца. На мільён жыхароў у нашай краіне прыходзіцца 51,7 трансплантацыі (для параўнання ў Расіі гэты паказчык складае 10,1), а паказчыкі лятальнасці і выжывальнасці не саступаюць еўрапейскім. Адметна, што з кожным годам колькасць аперацый расце, таму наспелі змены і ў заканадаўстве.

На вясенняй сесіі будзе разгледжаны законапраект «Аб змяненні закона аб трансплантацыі органаў і тканак». У прыватнасці, прапануецца пашырыць кола асоб, якія адносяцца да патэнцыяльных жывых донараў. Гэта будуць не толькі браты і сёстры, дзядулі і бабулі, як цяпер, але прадзядулі і прабабулі. Таксама законапраект прадугледжвае, што пра забор органаў і тканак у жывых донараў медыкі абавязкова павінны інфармаваць органы ўнутраных спраў. Робіцца гэта з мэтай папярэдзіць нядобрасумленныя здзелкі пры трансплантацыі.

Каб адмовіцца ад забору органаў і тканак пасля смерці, у нашай краіне варта загадзя скласці пісьмовую заяву. Калі ж чалавек перадумае і вырашыць забраць такую заяву (а такія выпадкі здараюцца), новае заканадаўства ўстановіць парадак вяртання такога пісьма і пералік тых асоб, якія змогуць гэта зрабіць. Акрамя таго, будзе створаны адзіны рэгістр аб трансплантацыі, дзе будуць утрымлівацца звесткі аб тым, каму яна праведзена, у каго забраны органы і каму іх трансплантуюць.

## Рэпрадуктыўныя тэхналогіі: узрост донараў павялічыцца

— У Беларусі створана адна з найлепшых на постсавецкай прасторы сістэм па ахове здароўя маці і дзіцяці, а ў свеце мы займаем 25-е месца сярод 179 краін па ўмовах камфортнасці для мацярынства. Тым часам праблема з рэпрадуктыўным здароўем існуе, — канстатуе Валянціна Курсевіч. — Каля 14 % пар пакутуюць на бясплоддзе. Прычым расце як жаночае, так і мужчынскае бясплоддзе.

Яшчэ адзін важны законапраект, які разгледзяць дэпутаты на вясенняй сесіі, — «Аб змяненні закона аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях». Заканадаўцы прапануюць пашырыць кола асоб, якія адносяцца да неананімных донараў. Цяпер імі могуць стаць толькі родныя пацыента. Паколькі інстытут ананімных донараў у нас развіўся пакуль не атрымаў, то мяркуецца, што неананімнымі донарамі могуць стаць не толькі сваякі пацыента. Таксама прапануецца ўнесці папраўкі, якія датычацца выкарыстання клетак аднаго донара ў дачыненні не больш чым да 20 пацыентаў, якім прымяняюцца дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі. Гэта робіцца, каб выключыць верагоднасць сустрэч у будучым асоб, пры зачацці якіх выкарыстоўваліся палавыя клеткі аднаго і таго ж донара.

Яшчэ адна папраўка ўносіцца па ініцыятыве Следчага камітэта: пры нараджэнні дзіцяці ад сурагатнай маці неабходна рабіць яго генетычную экспертызу. Гэта дазволіць пазбегнуць у будучым судовых іскаў. Акрамя таго, прапануецца павялічыць узрост сурагатнай маці да 49 гадоў у тых выпадках, калі яна з'яўляецца сваячкай сямейнай пары ці жанчыны, якая карыстаецца донарскай яйцаклеткай. Цяпер сурагатнай маці можа стаць жанчына ва ўзросце ад 25 да 35 гадоў, якая ўжо мае дзіця.

Таксама Валянціна Курсевіч расказала, якія пытанні ўзнікалі пры даапрацоўцы законапраекта. У выніку вырашана павялічыць узрост мужчын-донараў спермы да 40 да 50 гадоў. Узрост жанчын-донараў яйцаклеткі таксама павялічыцца да 49 гадоў, але толькі ў тых выпадках, калі яна з'яўляецца сваячкай. У астатніх выпадках узрост застаецца ранейшы — ад 18 да 35 гадоў.

Захоўваць донарскія клеткі можна будзе больш за 10 гадоў, бо сучасныя тэхналогіі дазваляюць гэта рабіць. Таксама жанчына можа захоўваць яйцаклеткі без медыцынскіх паказанняў, напрыклад, у выпадках, калі яна вырашае будаваць кар'еру і адкласці мацярынства. Акрамя гэтага, працэдуру ЭКА пры неананімным донарстве па-ранейшаму будуць рабіць толькі сямейным парам. Адзінокія жанчыны могуць скарыстацца клеткамі толькі ананімных донараў. Гэта робіцца, каб у будучым пазбегнуць прэтэнзій. Узрост жанчыны для працэдуры ЭКА не павышаецца і не зніжаецца — яе можна выканаць да 49 гадоў.

## Сістэму апекі ўдасканаляць

Новаўвядзенні прадугледжаны і ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб сям'і і шлюбе. Адпаведны законапраект рыхтуецца да першага чытання. У прыватнасці, будзе ўведзена такое паняцце, як шлюбны дагавор. А змяніць яго ці скасаваць можна будзе толькі па рашэнні суда.

Плануецца ўдасканаліць сістэму апекі і папячыцельства ў адносінах да паўналетніх, якія прызнаны недзеяздольнымі.

— Тэрытарыяльныя органы аховы здароўя будуць адказваць за недзеяздольных асоб, якія маюць псіхічныя захворванні, алкагольную ці наркатычную залежнасць. Астатнія асобы, якія не ўвайшлі ў сфарміраваны Міністэрствам аховы здароўя пералік, будуць знаходзіцца пад апекай органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, — адзначыла Валянціна Курсевіч.

Таксама законапраект прадугледжвае, што апеку над непаўналетнімі можна не афармляць, калі бацькі з уважлівай прычыны адсутнічаюць і пакідаюць дзяцей на блізкіх сваякоў на тэрмін да аднаго года.

Валянціна Курсевіч паведаміла, што змяненні і дапаўненні ў закон «Аб ахове здароўя» рыхтуюцца ў адпаведнасці з планам на бягучы год, у хуткім часе законапраект паступіць на разгляд дэпутатам. Асаблівую ўвагу ў ім плануецца аддаць павышэнню якасці і даступнасці меддапамогі. Шмат пытанняў будзе прысвечана кантралюемаму лячэнню ў амбулаторных умовах такіх хвароб, як туберкулёз, ВІЧ-інфекцыя, гепатыты і рассеяны склероз.

**Алена КРАВЕЦ.**

Блізкая ўлада

# СПІЛАВАЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

**Сем чалавек запісаліся на прыём грамадзян, які правёў у Дзяржынску старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка. Але губернатар выслухаў і тых, хто з'явіўся без папярэдняга запісу. Прычым са сваімі праблемамі да Анатоля Ісачанкі звярнуліся жыхары не толькі Дзяржынскага раёна, але і Мінска, Узды. Пытанні, як заўсёды, датычыліся самых розных тэм: зямельных адносін, атрымання сацыяльнага жылля, экалагічнай абстаноўкі ў сувязі з будаўніцтвам базавай станцыі мабільнага аператара сотавай сувязі, добраўпарадкавання.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

У прыватнасці, жыхарка вёскі Дабрынёва паскардзілася на старшыню мясцовага сельвыканкама, які, на думку жанчыны, занадта прыдзіраецца да заяўніцы, складае адміністрацыйныя пратаколы за нібыта неналежнае ўтрыманне дваровай тэрыторыі. Яна нават выклікала адпаведную камісію, якая прызнала санітарны стан падворка здавальняючым. Разам з тым на слайдах, якія прадэманстравалі падчас прыёму, было відаць, што двор засмечаны рознай непатрэбшчынай. «Разумею, што магчыма, не хапае грошай пафарбаваць дом, перакрыць дах, але элементарны парадак на сядзібе можна навесці», — рэзюмаваў Анатоль Ісачанка. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна даручыў прадстаўнікам адпаведных службаў яшчэ раз праверыць санітарны стан каля дома.

Жыхарцы Мінска, якой дастаўся бацькоўскі дом у адной з вёсак Дзяржынскага раёна, перашкаджаюць дрэвы, што ўзвышаюцца на мяжы яе ўчастка. Маўляў, у агародзе нічога не расце, бо бярозы далёка і глыбока пусцілі карані. Заяўніца патрабавала іх спілаваць. Работнікі Мінскага лясгаса праводзілі абследаванне дрэў і прыйшлі да высновы, што яны не з'яўляюцца аварыйнымі. «Няхай вучоныя яшчэ раз выедуць на месца і дадуць заключэнне, наколькі карані ўплываюць на ўраджайнасць, — даручыў Анатоль Ісачанка. — Пасля гэтага можна будзе прымаць меры».

Мінчане Васіль Аляксандравіч і яго сусед Віталь занепакоены, што побач з іх дамамі, якія яны набылі ў Дзяржынскім раёне, кампанія мабільнага аператара плануе ўзвесці вышку сотавай сувязі. На думку заяўнікаў, гэта не самым лепшым чынам паўплывае на экалогію. Акрамя таго, яны заклапочаны, што аб'ект небяспечны для здароўя. Як растлумачылі спецыялісты, участак для будаўніцтва вышкі выдзелены законна. А прадстаўнік мабільнага аператара прадэманстраваў наяўнасць усіх неабходных дакументаў і адпаведных экспертыз. Справа ў тым, што ўзвядзенне гэтага аб'екта — не прыхамаць кампаніі. Ён неабходны, каб ахапіць сотавай сувяззю ўчастак дарогі, па якой паедуць замежныя госці на II Еўрапейскія гульні. Старшыня Мінаблвыканкама даручыў усім зацікаўленым бакам пісьмова выкласці свае прэтэнзіі і довады літаральна па пунктах. Гэта дазволіць спецыялістам хутчэй прааналізаваць сітуацыю і зрабіць заключэнне. Пакуль жа будоўля будзе прыпынена.

У няпростую сітуацыю трапіла жыхарка Фаніпаля Валянціна Нікадзімаўна. Жанчына з'яўляецца апекуном недзеяздольнай сястры, якая жыве ў яе доме. Разам з тым у псіхічна хворай сваячкі ёсць асабістае жыллё, якое ў цяперашні час пустуе. Заяўніца хоча яго здаць па дагаворы пажыццёвага ўтрымання, каб чалавек, які будзе даглядаць сястру, зрабіў рамонт, прывёў сядзібу ў парадак. Аднак у яе ёсць унукі, якія ў выпадку смерці бабулі ўступяць у правы спадчыны. І тады яны запатрабуюць, каб рэнтаплацельшчык вызваліў памяшканне, растлумачыў губернатар заяўніцы. Спецыялісты аблвыканкама дадаткова вывучаць сітуацыю і дадуць адказ.

Юлія Віктараўна хадайнічала аб выдзяленні сацыяльнага жылля свайму брату — інваліду II групы. Справа ў тым, што яшчэ ў 1990 гадах мінулага стагоддзя дом, дзе жыла сям'я, знеслі. Хаты няма, а па пашпарце хлопец там прапісаны. Таму і ўзнікаюць складанасці. Анатоль Ісачанка даручыў вывучыць пытанне спецыяльна створанай камісіі з удзелам сродкаў масавай інфармацыі.

— Сітуацыя неадназначная. І тут усе часткова вінаватыя. Але пытанне неабходна вырашыць. Галоўнае — глядзець глыбей, каб правільна ўявіць сітуацыю і яе вынікі для кожнага з бакоў, — рэзюмаваў губернатар.

Усе пытанні, якія паднялі грамадзяне, дэталёва прааналізуюць адпаведныя службы Мінаблвыканкама, і заяўнікі атрымаюць кампетэнтныя адказы ва ўстаноўленыя законам тэрміны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Мытныя працэдуры будуць спрошчаны

**Плануецца, што для гасцей і ўдзельнікаў Еўрапейскіх гульняў пры перасячэнні мяжы Рэспублікі Беларусь будуць арганізаваны асобныя каналы руху, пазначаныя інфармацыйнымі аншлагамі. Акрамя таго, з Дзяржаўным мытным камітэтам Беларусі і Дзяржаўным пагранічным камітэтам краіны Дырэкцыяй II Еўрапейскіх гульняў была дасягнута дамоўленасць аб перамяшчэнні асобных катэгорый тавараў, што перамяшчаюцца спартсменамі, у пэўных аўтадарожных пунктах мытнага афармлення. Названыя меры дазволяць ажыццявіць мытныя аперацыі ў дачыненні да тавараў, што перамяшчаюцца ў рамках Еўрапейскіх гульняў, у максімальна кароткія тэрміны, паведамляецца на афіцыйным сайце II Еўрапейскіх гульняў.**

«Для тлумачэння ўдзельнікам і гасцям Еўрапейскіх гульняў мытных правілаў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі, мытным упраўленнем Дырэкцыі падрыхтавана інструкцыя па мытных пытаннях і грузаперавозках, — расказала сайту **начальнік мытнага ўпраўлення Дырэкцыі Марыя СТАШЭЎСКАЯ.** — Гэта своеасаблівы даведнік, які змяшчае дэталёвую інфармацыю аб мытных працэдурах і правілах, якія ўжываюцца ў дачыненні да тавараў, што будуць перамяшчацца праз мытную мяжу ў рамках правядзення Еўрапейскіх гульняў. Тэкст дакумента ўзгоднены з ДМК і размешчаны на афіцыйным сайце II Еўрапейскіх гульняў на англійскай і рускай мовах». Марыя Сташэўская адзначыла, што падрыхтоўка такога дакумента з'яўляецца стандартнай працэдурай пры арганізацыі міжнародных спартыўных мерапрыемстваў. Пры яго распрацоўцы быў вывучаны вопыт I Еўрапейскіх гульняў 2015 года ў Баку, Алімпійскіх гульняў у Сочы (2014), Рыа-дэ-Жанэйра (2016), Пхёнчхане (2018) і іншых буйных мерапрыемстваў.

Таксама ў Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў нагадалі, што летась кіраўніцтва мытных органаў Беларусі анансавала прынцыпе шэрагу мер па садзейнічанні ў арганізацыі II Еўрапейскіх гульняў. Гэта, напрыклад, мадэрнізацыя пунктаў пропуску праз дзяржаўную мяжу і абнаўленне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы, спрошчаны парадак мытнага дэкларавання пры часовым увозе транспартных сродкаў для асабістага карыстання і перамяшчэнні тавараў спартсменамі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# СПРЭЧНЫ ПАВІЛЬЁН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сродкі ў яго былі ўкладзены, каб не дапусціць стыхійнага гандлю, добраўпарадкаваць месца і пры гэтым не страціць пакупнікоў: рады сельскагаспадарчай прадукцыі — адзін са спосабаў прыцягнуць увагу да рынку, — тлумачыць **намеснік дырэктара па прававой рабоце арганізацыі «УруччаГандаль» Таццяна ЛІКУ.**

Але ўзнікла іншая праблема — узгадніць павільён з мясцовай уладай адміністрацыя рынку так і не змагла. Да таго ж высветлілася, што пад зямлёй, на якой размясцілі пабудову, праходзіць важны ўчастак водаправода. Калі здарыцца паломка, работнікі Мінскводаканала не змогуць у кароткія тэрміны атрымаць доступ да магчымага месца аварыі. Павільён аказаўся пад пагрозай зносу.

У адказ паднялася хваля абурэння сярод прадаўцоў і жыхароў раёна. Улады пайшлі насустрач — санкцыянавалі размяшчэнне павільёна на нейкі тэрмін. А кіраўніцтва рынку стала думаць, куды можна было б гэту пабудову пераставіць.

— Пачалі разглядаць варыянты. Атрымліваецца, што ўсё занята пад інжынерныя камунікацыі — за выключэннем пляцоўкі, адведзенай пад паркоўвачныя месцы. Звярнуліся ў ДАІ, каб высветліць, ці можна вызваліць тэрыторыю аўтастаянкі пад павільён. Там сказалі, што перапрафіляваць землі забаронена. Таму, як дзейнічаць далей — пытанне, — кажа Таццяна Ліку.

З 1 лютага павільён не функцыянуе. Тэрмін, які адміністрацыя раёну давала на яго перастаноўку, сканчыўся 13 сакавіка.

— Для нас гэты павільён — затраты. Толькі каб разабраць і пераставіць яго на іншае месца, патрэбна 25—30 тысяч рублёў. А яшчэ ж неабходна будзе распрацаваць праект правілаў дарожнага руху. Прасцей усё знесці і забыць. Пакідаць пабудову — гэта штраф для мяне, — указвае на іншы бок сітуацыі **кіраўнік спраў «УруччаГандаль» Дзмітрый ПАДАЛІЦКІ.** — Але ў мяне ёсць пэўныя сацыяльныя абавязкі. 70 працэнтаў месцаў для гандлю ў павільёне выдзяляецца бясплатна — пенсіянерам, інвалідам. У сезон гэтай магчымасцю карыстаецца каля 100 чалавек.

— Да нас не спыняюцца паходы людзей, — дадае Таццяна Ліку. — І мы не ведаем, што ім казаць. Прадаўцы ўжо пачынаюць браніраваць месцы на сезон.

### Рашэння пакуль няма

Жыхары Першамайскага раёна накіроўвалі ў высокія інстанцыі калектыўны зварот з просьбай захаваць павільён. Пад ім падпісалася каля 400 грамадзян. На мінулым тыдні на месца выязджала камісія з прадстаўнікоў гарвыканкама і адміністрацыі раёна, каб разабрацца ў сітуацыі. Яшчэ да пачатку сустрэчы, каля ўваход на рынак сабраўся натоўп мясцовых жыхароў, якіх хвалюе лёс гандлёвых месцаў.

Як «Звяздзе» адказалі ў ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, перашкод для пераносу пабудовы ўсё ж такі няма. Трэба толькі прадставіць праект на будаўніцтва паркован замест тых, на месцы якіх будзе стаяць павільён. Іншае пытанне: ці ўдасца знайсці гэтыя кампенсацыйныя месцы на невялікай тэрыторыі рынка? І колькі грошай на гэта спатрэбіцца?

Што чакае павільён, пакуль невядома. Не выключана, што пляцоўка для кірмашоў выхаднога дня вернецца да таго выгляду, у якім была ў 2016-м. Прадаўцы між сабой перагаворваюцца, што пры такім раскладзе некаторыя пенсіянеры вернуцца гандляваць да метро, хоць гэта і забаронена: там таксама няма навесаў, затое месца больш людное. **Начальнік Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ніна ЕМЯЛЬЯНАВА** паабяцала, што рашэнне будзе падрыхтавана да 25 сакавіка.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Ноу-хау

## І ПАКАЗАЎ КАНТРАЛЁРУ ЭЛЕКТРОННЫ БІЛЕТ

**Правайдар электронных плацяжоў разам з банкам і партнёрамі запусцілі аплату праезду ў грамадскім транспарце з дапамогай смартфона.**

Такім чынам кампанія Assist Belarus сумесна з Беларусбанкам і акцыянерным таварыствам «БайТэхСэрвіс» рэалізавалі пілотны праект па аплаце праезду ў транспарце горада Брэста.

Сэрвіс працуе праз мабільную праграму ТІХ. Для гэтага неабходна зарэгістравацца і прывязаць плацежную картку. Набыць электронны білет можна ў раздзеле «Мае квіткі». Набыты электронны білет захоўваецца ў асабістым кабінеце карыстальніка. Аплата праезду робіцца пры ўваходзе ў транспарт з выкарыстаннем функцыі праграмы «аплаціць» альбо шляхам сканавання QR-кода, размешчанага ў транспартным сродку.

У выпадку праверкі дастаткова паказаць кантралёру электронны білет, захаваны ў раздзеле «Мае паездкі». Вось і ўсё. Праграма даступная для запампоўкі ў App Store і Google Play.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## У КОПАНЦЫ ПАТАНУЛА ДЗЯЎЧЫНКА

**Здарэнне адбылося ў Хойніках. На штучным вадаёме загінула дзяўчынка 2006 года нараджэння.**

Няшчасны выпадак адбыўся вечарам. Па інфармацыі абласной арганізацыі ратавання на водах, дзве сяброўкі прагульваліся каля невялікай копанкі, фатаграфаваліся на беразе закінутага вадаёма. У нейкі момант адна з дзяўчынак аступілася і ўпала з крутога берага адкосу ў ваду. Другая адразу патэлефанавала дарослым. Людзі хутка былі на месцы здарэння і дасталі дзіця, перадаўшы медыкам. Але тыя мусілі канстатаваць смерць. Па факце здарэння праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветны банк ацаніў шкоду арабскіх краін ад канфліктаў у рэгіёне ў $900 млрд

Узброеныя канфлікты ў арабскіх краінах прывялі да значнай фінансавай шкоды і паставілі некаторыя дзяржавы рэгіёна на мяжу эканамічнага краху, паведамілі арабскія СМІ са спасылкай на прадстаўніка Сусветнага банка. Па словах першага памочніка кіраўніка СБ Махмуда Мухідзіна, агульны памер шкоды арабскаму свету ад канфліктаў у Сірыі, Лівіі і Емене ў 2010—2018 гадах дасягнуў 900 мільярдаў долараў. Пры гэтым ён адзначыў, што ў арабскіх краінах 60 працэнтаў аб'ёму валавога ўнутранага прадукту прыпадае на 10 працэнтаў насельніцтва, а ў еўрапейскіх дзяржавах гэты паказчык складае 45 працэнтаў.

### У Мазамбіку ў выніку паводкі загінулі дзясяткі чалавек



Па меншай меры 66 чалавек загінулі ў выніку паводкі ў цэнтральнай і паўночнай частках Мазамбіка, усяго стыхія закранула больш за 140 тысяч жыхароў, паведамляе агенцтва France-Presse са спасылкай на мясцовы ўрад. Акрамя таго, паводка знішчыла 18 бальніц пацярпелага раёна. Па даных ААН, з-за стыхіі больш за 17 тысяч чалавек вымушаны былі пакінуць свае дамы, зараз яны размешчаны ў транзітных цэнтрах. «Урад абвясціў аб чырвоным узроўні трывогі з-за працяглых дажджоў і назірання трапічнага цыклону «Ідай», чакаецца, што ён дасягне краіны ў чацвер-пятніцу», — заявіла прадстаўнік кабінета міністраў Ана Камаана. Паводле прагнозаў спецыялістаў, цыклон будзе суправаджацца дажджамі, хуткасць ветру дасягне 220 кіламетраў за гадзіну. Па ацэнках улад, на дапамогу пацярпелым ад стыхіі жыхарам краіны неабходна будзе выдзеліць каля 18 мільёнаў долараў.

### Шатландскі віскі прызнаны найлепшым аб'ектам для інвестыцый



Інвестыцыі ў рэдкія гатункі шатландскага віскі прынеслі значна больш выгады, чым укладанні ў іншыя віды прадукцыі і маёмасці: творы мастацтва, віно, рарытэтныя аўтамабілі ці нерухомасць. Аб гэтым сцвярджаецца ў прадстаўленым даследаванні The Wealth Report 2019 міжнароднай кансалтынгавай кампаніі Knight Frank. У дакладзе звяртаецца ўвага на павелічэнне продажаў выраблёнага ў Шатландыі віскі ў такія краіны, як Індыя (рост на 44 працэнты), Кітай (35 працэнтаў) і Сінгапур (24 працэнты), пры гэтым амаль трэць экспарту прыпадае на аднасаладавыя віды напою. «Рынак рэдкіх і вінтажных бутэлек прадэманстраваў надзвычайны рост за апошнія дзесяць гадоў як з пункту гледжання аб'ёмаў продажу, так і цэн на яго», — сказаў Эндзі Сімпсан, заснавальнік кампаніі Rare Whisky 101, якая адсочвае інвестыцыйную прывабнасць гэтага напою. Параўнальны аналіз росту цэн на рэдкія сарты віскі і іншыя аб'екты для інвестыцый за апошні год і дзесяцігоддзе паказвае, што для віскі ён склаў 40 і 582 (!) працэнты адпаведна. Манеты падаражэлі на 12 і 193 працэнты, віно — на 9 і 147 працэнтаў, творы мастацтва — на 9 і 158 працэнтаў, гадзіннікі — на 5 і 73 працэнты, аўтамабілі — на 2 і 258 працэнтаў. Цэны на элітную нерухомасць у цэнтры Лондана ўпалі на 4,4 працэнта за апошні год, а на каштоўнасці — на 5 працэнтаў, аднак у перспектыве дзесяцігоддзя паказалі рост на 52 і 112 працэнтаў адпаведна.

## Сталічны ЧАС

• Аэраздымку з верталёта праводзяць для праверкі стану цепласетак Мінска. Аб гэтым БелТА паведамілі ў філіяле «Мінскія цеплавыя сеткі РУП «Мінскэнерга». Работы павінны праводзіцца да 11 сакавіка, але іх перанеслі з-за дрэннага надвор'я. Палёты з выкарыстаннем спецыяльнага цеплавізара дазваляюць выявіць цеплавыя анамаліі, сярод якіх — пашкоджанні, недастатковую цеплавую ізаляцыю на трубаправодах, іх затапленне. Будзе складзена табліца папярэдніх аператыўных вынікаў.

• Гістарычныя рэканструкцыі каля сталічнай ратушы пачнуцца ў маі і працягнуцца да кастрычніка, будуць праходзіць кожную суботу з 12 да 13 гадзін. Аб гэтым агенцтву «Мінск-Навіны» расказаў кіраўнік клуба «Менская харугва», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мілаванаў. «Праграма стане больш разнастайнай. Мы пастаянна вывучаем новыя кнігі і дакументы, якія датычацца жыцця нашых продкаў. Гледачы змогуць прыняць удзел у бітвах, прайшоўшы інструктаж па тэхніцы бяспекі. Будзе шмат музыкі і танцаў», — адзначыў Міхаіл Мілаванаў.


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 02.04.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 80 %)**

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 700/С-72613 (административное здание), площадь – 393,5 кв. м; капитальное строение с инв. № 700/С-72616 (ремонтные мастерские), площадь – 774,3 кв. м; капитальное строение с инв. № 700/С-72615 (сварочно-прицепное отделение), площадь – 278,9 кв. м; капитальное строение с инв. № 700/С-103633 (котельная), площадь – 16,9 кв. м; капитальное строение с инв. № 700/С-90252 (склад), площадь – 67,9 кв. м, с мощением асфальтобетонным (16 761,6 кв. м), ограждением – железобетонные плиты на железобетонных столбах (длина – 364,4 м, высота – 2,3 м); линия электропередачи КЛ-0,4кВ тип кабеля АВВГ 3х25+1х16 кв. м, протяженность – 296 м. Сведения о земельном участке: лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000007000134 площадью – 1,9509 га, расположенном по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1, предоставленным на праве аренды. Доля в праве аренды: 497/500.

**Начальная цена продажи: 119 475,23 бел. руб. с учетом НДС (20 %).**
**Сумма задатка: 11 947,52 бел. руб.**

**Аукцион состоится 2 апреля 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесения задатка: по 01.04.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

Продавец: ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а, тел. 73-57-84

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. и затраты на организацию аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 13.11.18, 18.12.18 и 05.01.19

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25**



Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 117**

| № лота | Инв. номер по бух. учету | Наименование | Начальная цена лота с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | 00000873 | **Грузовой автомобиль GAZ-5312, специальный, вышка, 1989 г. в., рег. знак АК 8396-5** | **5 690,00 бел. руб.** |
| 2 | 00000888 | **Экскаватор одноковшовый ЭО 2621 на шасси трактора ЮМЗ-6КЛ, 1988 г. в., рег. знак ОМ-5 4793** | **3 817,00 бел. руб.** |

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Дата и время проведения аукциона: 18.04.2019** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.04.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**


**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка ўпраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Брашко Мікалаю Мікалаевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні свайму калегу Брашко Алегу Мікалаевічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

Тры пытанні да ўлады

# Самая вялікая праблема — дэмаграфія

**Для таго каб мець упэўненасць у заўтрашнім дні, рэгіёну, нават невялікаму, недастаткова мець адну паспяховую кампанію. Горад Круглае — выразны таму прыклад. Зусім нядаўна Круглянская перасоўная механізаваная калона № 266 была галоўным градаўтваральным прадпрыемствам, забяспечвала раёну ўсе паказчыкі, давала годныя заробкі дзвюм тысячам работнікаў, адбудоўвала горад і напаўняла райцэнтр якаснымі паслугамі. Аднак летась прадпрыемства сутыкнулася з вялікай колькасцю праблем, і раёну прыйшлося шукаць новыя апоры. Мы распыталі старшыню Круглянскага райвыканкама Івана БАРТАШЭВІЧА пра тое, наколькі гэта ўдалося.**



**— Іван Мікалаевіч, раскажыце, з чым Кругляншчына сустракае вясну?**

— Наш рэгіён аграпрамысловы: тут працуюць сем сельгасарганізацый і 15 фермерскіх гаспадарак. Землі добрыя, па ўзроўні ўрадлівасці гэтакія ж, як на Шклоўшчыне, у суседнім Бялыніцкім і ў Горацкім раёнах. Бал урадлівасці пашы больш за 36, таму тут заўсёды атрымлівалі годныя ўраджаі. Летась, як ўсюды ў Беларусі, на жніве адбілася засуха: мы не даатрымалі збожжа каля 40 % да ўзроўню 2017 года. Для кукурузы і шматгадовых траў наадварот — надвор'е было спрыяльнае, мы заклалі і кукурузнага сіласу ў дастатковай колькасці, і травяністых кармоў.

Зіма нам пакінула надзеі на добры ўраджай. Вясну чакаем цёплую і ранню́ю, без моцнай паводкі. Мы зараз вывозім на палі арганіку, працуе звяно Круглянскага аграпрамтэхзабеспячэння, кампенсуем недахоп дарагіх фосфарных угнаенняў. Закупляем і мінеральныя ўгнаенні, з улікам аплаты забяспечаны азотнымі на 26 %. Вырашаем пытанне праз Магілёўскі мясакамбінат, які бярэ крэдыт, і праз кампанію «Бабуліна крынка». Да таго ж гаспадаркі самі перакрэдытоўваюцца па 155-м указе. На сённяшні дзень угнаеннямі для падкормкі азімых культур мы забяспечаны. Паступова назапашваем іх пад яравую сяўбу.

Калі захоўваць усе агратэхнічныя прыёмы: своечасова пасеяць, выканаць догляд за пасевамі, то залежнасць ад надвор'я можна мінімізаваць. Тэхніка ў раёне для гэтага ёсць.

Што датычыцца кадравага забеспячэння сельгаспрадпрыемстваў, — няма пытанняў па інжынернай службе ў механізацыі, аграномічная служба ўкамплектаваная. Не хапае жывёлаводаў: урачоў і заатэхнікаў. Шукаем, адпраўляем на навучанне тэхнікаў-асемянатараў, ад іх у многім залежыць аднаўленне статка.

Працуем з моладдзю. Многія маладыя спецыялісты застаюцца, асабліва мясцовыя. Яны адпрацоўваюць, ствараюць сем'і, мы даём ім жыллё.

Жыллё будуем пакуль толькі ў райцэнтры. Запланавалі на сёлета два 20-кватэрныя дамы. Адзін з іх ужо ўзводзіцца.

У нас для моладзі створаны добрыя ўмовы. Мясціны тут вельмі прыгожыя, ёсць цудоўныя ўмовы для адпачынку. У нас вельмі добрая экалогія: заводаў няма, шкодных выкідаў няма. Напэўна, Кругляншчына — самая чыстая зона ў вобласці. Таму да нас з задавальненнем прыязджаюць турысты. У нас ёсць Мікалаеўскія сажалкі, якія вельмі любяць і беларусы, і расіяне.

Садкамі і школамі, медыцынскімі ўстановамі мы забяспечаны. У нас хапае школьных аўтобусаў. Іншая праблема: ёсць школы, дзе колькасць дзяцей амаль такая ж, як колькасць настаўнікаў і тэхперсаналу. Таму некаторыя прыходзіцца зачыняць, некаторыя ўзбуйняць. Але гэта не адбіваецца на дзецях і бацьках. У нас школы добра аснашчаныя, маюць інтэрактыўныя дошкі, сучаснае абсталяванне.

Трэба сказаць, што дэмаграфічная сітуацыя ў Круглянскім раёне складаная: смяротнасць удвая перавышае нараджальнасць, але за два месяцы гэтага года нарадзілася на чатыры дзіцяці больш, чым за аналагічны перыяд летась. Пры гэтым смяротнасць засталася на папярэднім узроўні.

Мы шмат увагі аддаём і старым. У Шапялевічах маецца бальніца сястрынскага догляду. Рэгулярна наведваюць яе сацыяльныя работнікі, медыкі, ідэолагі, ратавальнікі, прадстаўнікі ўсіх службаў раёна.

Прадстаўнікі ўлады сустракаюцца з пенсіянерамі, размаўляюць пра ўсё, што тых хвалюе: газазабеспячэнне, дарогі, добраўпарадкаванне. Па выніках такіх сустрэч складаецца пратакол даручэнняў старшыні райвыканкама, каб вырашаць праблемы людзей. Не ўсё ўдаецца зрабіць адразу, некаторыя пытанні патрабуюць часу і сродкаў.

Не забываем ветэранаў, віншуем іх са святамі, дапамагаем прадуктамі, у вядзенні падсобнай гаспадаркі. Ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны засталося ў раёне няшмат. Увогуле, ветэраны ў нас актыўныя і даюць добры прыклад маладым. Яны аб'ядноўваюцца ў свае арганізацыі пры цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, пры музеі, бібліятэцы, раённым доме культуры. Бачылі б вы, як прыгожа спяваюць і якія строі ствараюць удзельнікі ветэранскага хору «Надзея»! Гэтыя людзі натхняюць астатніх, у тым ліку маладых.

**— Круглянчшына можа пахваліцца вопытам прыватных інвестыцый. Раскажыце пра гэта, калі ласка.**

— На тэрыторыі былога льнозавода засталіся шохі (вялікія адкрытыя па баках навесы для захоўвання трасты. — **«Зв.»**), якія не выкарыстоўваліся, бо вытворчасць у Круглым пасля аб'яднання з холдынгам «Магілёўабллён» закрылі. Калі раней мы вырошчвалі і перапрацоўвалі лён, то цяпер аказваем паслугі Шклоўскаму льнозаводу — сеем 1000 гектараў гэтай культуры.

Прыватная кампанія «Рамісдрэўкамплект» спачатку выкупіла адну шоху. Раней яе вытворчасць была паблізу ад жылых дамоў, шум і пыл перашкаджалі людзям. Уладальнік перавёз абсталяванне на тэрыторыю былога льнозавода, абшыў шохі, і цяпер там працуюць 100 чалавек. Яны займаюцца дрэваапрацоўкай, наладзілі безадходную вытворчасць. Выраблююць палеты і прадаюць іх у Германію. Разам з цагляным заводам «Усходні», які перапрацоўвае адходы поліэтылену, гэтыя дзве кампаніі забяспечваюць даведзенае раёну заданне па экспарце.

Цяпер «Рамісдрэўкамплект» плануе пашырацца і запускае вытворчасць яшчэ адной запатрабаванай за мяжой прадукцыі — пелет.

**— Іван Мікалаевіч, вы працуеце ў Круглым ужо год. Якія характэрныя рысы мясцовых жыхароў заўважылі?**

— Тутэйшыя людзі лагодныя і вельмі гасцінныя: гэта заўважаюць усе прыезджыя. Прыветлівыя і працаздольныя: раён невялікі, але паказчыкі кажуць самі за сябе. У нас ёсць традыцыя святкаваць Дзень вёскі. У 2018 годзе рабілі яго ў Прыганях. Збіраем людзей, якія жылі там, а цяпер з'ехалі за мяжу або ў іншыя рэгіёны. Ушаноўваем перадавікоў, ветэранаў, ладзім канцэрт, выязны гандаль. Людзям вельмі падабаецца.

Круглянчшына для мяне стала роднай.

**Што датычыцца ПМК № 266, то прадпрыемства, запэўніў старшыня райвыканкама, паступова выходзіць з крызісу. Яно выйграла тэндары на будаўніцтва ў Магілёве, Талачыне, Шклоўскім раёне, тым самым забяспечыла сябе работай. Акрамя таго, арганізацыя шукае новыя нішы: выраблае тратуарную плітку, блокі, шклопакеты. Раён спадзяецца, што кампаніі ўдасца выйсці на ўзровень 2015—2016 гадоў, і тады паказчыкі па сацыяльна-эканамічным развіцці раёна будуць выкананыя ўсе без выключэння.**

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
*г. Круглае.*


**Акционерам ОАО «Лукомльэнергомонтаж», 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8. Извещение о созыве очередного (годового) общего собрания акционеров**

Собрание состоится **28 марта 2019 г. в 10.00** по адресу:

211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 08.00 до 09.45. Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 1 марта 2019 года. Орган, созывающий собрание: Наблюдательный совет. Основание созыва собрания: решение Наблюдательного совета от 15 февраля 2019 г. (протокол № 2).

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2018 году и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год.
2. Утверждение годового отчета Общества, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества, о распределении прибыли и убытков Общества по результатам 2018 года с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
3. Утверждение распределения и использования прибыли (покрытия убытков), выплате дивидендов за 2018 год и направлений распределения прибыли на 2019 год и 1-й квартал 2020 года.
4. Об избрании членов Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.
5. Утверждение условий вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. О приобретении Обществом акций собственного выпуска.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 7 марта 2019 г. у бухгалтерии Общества с 13.00 до 16.00, в день проведения собрания – по месту его проведения.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров – также документов, подтверждающих полномочия на участие в собрании.

Наблюдательный совет ОАО «Лукомльэнергомонтаж».

УНП 300007839



**Информация о внесении изменений в извещение о проведении аукциона**

В извещении о проведении аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «Клецкий производственно-пищевой завод», опубликованном в газете «Звязда» от 14.02.2019 на стр. 11, вносятся следующие изменения:

Задаток за участие в аукционе составляет 4 % от начальной цены – **32 851,00** белорусского рубля.

УНП 690324015

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже гостиницы «Эллада», принадлежащей унитарному предприятию «Торговый дом «Белфут»**

**Лот № 1.** Встроенное помещение гостиницы «Эллада» с инв. № 330/D-61007, 1979 г. п. Площадь 853 кв. м. Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, б-р Юности, д. 26. **Начальная цена** с НДС – 300 000,00 бел. руб. **Задаток** – 31 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота № 1 в течение 10 (десяти) дней с даты подписания договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 2 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

**Аукцион состоится 15.04.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: унитарное предприятие «Торговый дом «Белфут», г. Мозырь, ул. Нефтестроителей, д. 10, тел. 8 (0236) 25-29-46.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, т. 8 (017) 324-70-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже Лота № 1, принадлежащего унитарному предприятию «Торговый дом «Белфут», проводимом 15.04.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 11.04.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Киселева Светлана Николаевна, тел.: 8 0236 33-67-78, 8 (33) 652-93-58

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**Уважаемые акционеры ОАО «Дрожжевой комбинат»! 25 марта 2019 года в 11.00 проводится общее годовое собрание акционеров общества по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 14, актовый зал**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1) Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Дрожжевой комбинат» в 2018 году и основных направлениях деятельности общества на 2019 год.

2) Отчет наблюдательного совета общества за 2018 год.

3) Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2018 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету ОАО «Дрожжевой комбинат». Ознакомление общества с заключением аудиторов.

4) Утверждение годовых отчетов, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Дрожжевой комбинат» за 2018 год.

5)Утверждение распределения чистой прибыли за 2018 год. О выплате дивидендов за 2018 год.

6) О направлениях использования чистой прибыли общества на 2019 год.

7) Избрание членов наблюдательного совета и членов ревизионной комиссии ОАО «Дрожжевой комбинат».

8) О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

9) О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Дрожжевой комбинат».

10) Об утверждении Положения о наблюдательном совете ОАО «Дрожжевой комбинат».

Время начала регистрации: 10.20. Время окончания регистрации: 10.50.

Дата формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в собрании, 15.03.2019 года.

УНП 100104781

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **комплекта оборудования для выдува ПЭТ-бутылок инв. № по бух. учету 050802, в составе:**

**– полуавтомат выдува ПЭТ-бутылок СП-8У-16, заводской № 0280309;**
**– полуавтомат выдува ПЭТ-бутылок СП-8У-16, заводской № 0290309;**
**– станция-разогрева преформ СП-8/2 (ТС), заводской № 0390309;**
**– пресс формы для выдува бутылок объемом V = 0,1 л. (комплект 2 шт.)**

Начальная цена с НДС (20 %) – **5 963,26 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **596,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 77 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 17.10.2018, 30.11.2018. Аукцион состоится **28.03.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.03.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

В суд Фрунзенского района г. Минска поступило заявление о признании безвестно отсутствующей Кажуро Серафимы Семеновны 21 марта 1923 года рождения, последнее известное место жительства которой: Минская область, Вилейский район, д. Шипки, с просьбой к гражданам, располагающим какими-либо сведениями о Кажуро Серафиме Семеновне, сообщить их суду Фрунзенского района г. Минска в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

**Отчет местного благотворительного Фонда детей-инвалидов с художественными способностями «Голубые берега» г. Могилева об использовании своего имущества за 2018 год**

1. Стоимость имущества составила 7870,39 бел. руб.
2. Поступления от проводимых в соответствии с Уставом фонда мероприятий – 2796,79 бел. руб.
3. В т. ч. поступления от частных и юридических лиц – 1777,42 бел. руб.
4. Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общеполезных целей, указанных в Уставе, – 2796,79 бел. руб.
5. Арендные и коммунальные платежи фонда составили: 1878,96

**Всего баланс фонда составил 7870,39 бел. руб.**

6. Количество учредителей фонда – 3.
7. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНН 790175626

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

14 САКАВІКА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 5 (15860)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

# Аляксей РОМ: «Шансон — ужо не толькі блатная песня»

**Яго песні не першы год скараюць хіт-парады як беларускіх, так і расійскіх, а таксама ўкраінскіх радыёстанцый. Ён — выканаўца шансона, чалавек, які спявае душой, і проста «дашчэнту» мужчына, пасля інтэрв'ю з якім ужо чакаеш наступнай з ім сустрэчы!**

***— Калі да вас прыйшло ўсведамленне, што хочаце стаць артыстам?***

— Цяжка сказаць, як і адкуль. Проста з самага ранняга дзяцінства ведаў, што хачу спяваць на сцэне. Ведаеце, я амаль нічога дзеля гэтага не рабіў. Лёс сам за мяне ўсё вырашыў.

***— Няўжо вы не навучаліся музыцы?***

— Музычнай адукацыі, на жаль ці на шчасце, у мяне няма. Я ўмею іграць на гітары, але выключна на аматарскім узроўні. У юнацтве гэта было вельмі добрым бонусам для таго, каб падабацца дзяўчынкам. *(Смяецца).* Былі частыя вячоркі на лавачках, у альтанках і пад'ездах. Гітара ў той момант была маім верным спадарожнікам і памочнікам. Музычную школу не наведваў, а набіраўся ведаў і вопыту ў двары.

***— А адкуль узяўся такі незвычайны псеўданім — «РОМ»?***

— Усё вельмі банальна. Лічу сваё поўнае імя — Якімовіч Аляксей Раманавіч — не вельмі сцэнічным, таму, калі прыйшоў час, прыдумаў псеўданім Аляксей РОМ. Гэта ініцыялы імя і імя па бацьку маіх бацькоў. Тату завуць Раман Мечыслававіч, а маму Вольга Міхайлаўна. Таму я не лічу, што падвёў свой род, змяніўшы прозвішча на псеўданім, лічу, што ўсе заўсёды са мной. Я заўсёды пішу «РОМ» заглаўнымі літарамі.

***— Чаму выбралі менавіта шансон?***

— Я рос і сталеў у «ліхія» 1990-я. Мы, будучы падлеткамі, слухалі не толькі групу «Рукі ўверх», але і шансон. І, вядома, спявалі пад гітару. Акрамя таго, з 18 гадоў пачаў працаваць вакалістам у рэстаранах, спяваць на вяселлях. А ў той час менавіта шансон быў асновай рэпертуару. Пазней я запісаў свае першыя песні, але гэта была папса. Мне вельмі хацелася, каб яны гучалі па радыё і тэлебачанні, а тады туды можна было трапіць, толькі выконваючы папулярную музыку. Але з часам прыйшло ўсведамленне, што гэта не маё, ды і гледачу мала цікавае. Я пачаў больш давяраць свайму густу і сваім адчуванням. Пачаў спрабаваць рабіць тую музыку, якая мне блізкая, і адчуў рэальную аддачу ад гледача і слухача. Пасля гэтага шансону я ўжо не здраджваў.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***



Сваімі рукамі

# МАЙСТАР З ВОСЬМАГА КЛАСА



**Ці магчыма быць гарэзам, і ў той жа час засяроджана, старанна выразаць з дрэва рэалістычныя фігуры? Ягор ЖУКОЎСКІ, васьмікласнік чэрвеньскай СШ № 2 без цяжкасцяў можа сумяшчаць у сабе гэтыя супрацьлеглыя якасці. Як і многія ў яго ўзросце, падлетак любіць бясклапотна бавіць час, аднак, дзякуючы прыроднай уседлівасці, атрымлівае не толькі задавальненне ад хобі, але і ўзнагароды. Нядаўна Ягор прадставіў сваю работу «Тры Парсючкі, якія стаяць на лыжах» на XXII Рэспубліканскай выстаўцы-конкурсе дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў «Калядная зорка» і атрымаў Дыплом першай ступені ў намінацыі «Зімовы спорт».**

...У школе васьмікласнік, як ён сам прызнаецца, вучыцца «ну так, сярэдне», а вось да руплівай працы яго цягне змалку. І цяпер стараецца дапамагчы не толькі маці і дзядулі, з якімі жыве, але і суседзям: падмесці ў двары, прыбраць груваасткія кавалкі шыферу ці скласці раскіданыя пасля рамонту дошкі. А ў вольны час, калі работы няма, аддае перавагу не інтэрнэту, а вясёлым і непрадказальным гульням з сябрамі на свежым паветры.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

Старт кар'еры

# ВЕРДЫКТ РАБОТАДАЎЦА: БРАЦЬ... ЦІ НЕ

## Чаму праслаўтуты бляск у вачах такі важны для «рэкруцёраў»?



Ганна Шагун: «Адна з памылак саіскальнікаў — завышаныя патрабаванні, у прыватнасці, па заробках. Цвярозае бачанне свету ніхто не адмяняў!»

**«Вітаю вас, паважаная Ірына Алегаўна! Мяне вельмі зацікавіла вакансія «малодшы спецыяліст у аддзеле кансультавання». Упэўнены, што змагу спраўдзіць усе Вашы чаканні і атрымаць гэтую пасаду. На працягу двух апошніх курсаў ва ўніверсітэце я быў валанцёрам у ТАА «Дапамажы іншаму». За гэты час навучыўся вырашаць канфліктныя сітуацыі і знаходзіць падыход да людзей розных сацыяльных слаёў. Мой досвед работы афіцыянтам у кавярні «Вясёлка» навучыў мяне, у сваю чаргу, хутка запамінаць вялікую колькасць інфармацыі і папярэджваць жаданні гасцей. З усіх работнікаў у мяне заўсёды былі самыя вялікія чаявыя. Буду ўдзячны за Ваш час, які вы ўдзеліце маёй кандыдатуры». Як вы думаеце, ці зможа такі суправаджальны ліст да рэзюмэ зацікавіць наймальніка? Не сакрэт, што ў апісанні многіх вакансій утрымліваецца адно патрабаванне, якое становіцца для моладзі сур'ёзнай перашкодай — «Вопыт работы абавязковы». Але адкуль апошняму ўзяцца, калі ты толькі скончыў вучобу? Увогуле, як правільна скласці рэзюмэ, каб цябе заўважылі на кадравым рынку і запрасілі на сумоўе? Каго шукаюць сёння работадаўцы? Якія прафесійныя кампетэнцыі і асабістыя якасці саіскальнікаў запатрабаваныя наймальнікамі? Пра ўсё гэта ішла гаворка падчас майстар-класа, які ў рамках выстаўкі «Адукацыя і кар'ера — 2019» правяла для выпускнікоў, студэнтаў і ўсіх тых, хто знаходзіцца цяпер у пошуку работы, PR-менеджар найбуйнейшага партала працаўладкавання Ганна ШАГУН.**

### НЕ ПАТРАБУЙЦЕ ЎСЁ І АДРАЗУ

— У мяне для вас ёсць добрая навіна: сёння для пошуку работы ёсць мора інфармацыі і не менш магчымасцяў, — падбадзёрвае Ганна Шагун. — Адна з іх — гэта выкарыстанне job-рэсурсаў накшталт нашага партала. Яны дазваляюць азнаёміцца адразу з вялікай колькасцю вакансій, не звязваючыся з работадаўцам, пры гэтым можна ўстанавіць фільтр пошуку вакансій па патрэбных параметрах, сэканоміць час на рассылку рэзюмэ і атрымаць хуткі адказ на ваш запыт. Для прыкладу, па стане на 1 лютага гэтага года на нашым партале было прадстаўлена больш як 24 тысячы вакансій і амаль 1,9 мільёна рэзюмэ. Найбольшая колькасць вакансій (27 % ад агульнай колькасці) была ў сферы продажаў.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

# ВЕРДЫКТ РАБОТАДАЎЦА: БРАЦЬ... ЦІ НЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

На другім месцы ішлі «інфармацыйныя тэхналогіі, інтэрнэт, тэлекам» (12,1 %) і «рабочы персанал» (11,7 %) — на трэцім. А вось сярод выстаўленых на сайце рэзюмэ самая вялікая колькасць (больш як 24 %) прыпадала на «старт кар'еры». Каля 15 % ад агульнай колькасці рэзюмэ былі нацэлены на сферу продажаў, 6,6 % — на транспарт і лагістыку, 6,5 % — на бухгалтэрыю і фінансы, столькі ж — на вытворчасць, 4,9 % — на «інфармацыйныя тэхналогіі, інтэрнэт, тэлекам».

Летась самая вялікая канкурэнцыя назіралася менавіта ў катэгорыі «старт кар'еры», дзе на адну вакансію прыпадала 26,5 рэзюмэ. Для параўнання, у катэгорыі «бухгалтэрыя, кіраўніцкі ўлік, фінансы прадпрыемства» на адну вакансію было 6,7 рэзюмэ, «адміністрацыйны персанал» — 6, «вытворчасць» — 4,2...

**«Практыка падчас вучобы не фармальнасць, а рэальны шанц для студэнтаў заявіць пра сябе».**

У снежні мінулага года партал праводзіў анлайн-апытанне 139 работадаўцаў, падчас якога высветлілася, што кожны другі з іх ставіцца да людзей без досведу работы (студэнтаў і маладых спецыялістаў), у прынцыпе, пазітыўна, але пры ўмове, калі тыя дэманструюць сваю зацікаўленасць і гатоўнасць да навучання.

— Не забудзьцеся пра гэты важны нюанс (вашу гатоўнасць навучацца) на сумоўі і пры складанні рэзюмэ, — раіць Ганна Шагун. — Прыкладна трэцяя частка работадаўцаў ставяцца да людзей без досведу работы нейтральна, і гэта таксама добрая навіна. І толькі крыху больш як 7 % наймальнікаў не вельмі рады маладым спецыялістам, але зусім не з прычыны адсутнасці ў іх працоўнага досведу, а з-за таго, што сутыкаліся з катэгорыяй людзей, якія яшчэ на старце заяўляюць завышаныя патрабаванні: яны яшчэ нідзе не працавалі, але называюць сумы заробку, якія плацяць спецыялістам з пэўнымі кампетэнцыямі і прафесійным багажом. Натуральна, што такія паводзіны адштурхоўваюць работадаўцаў. Цвярозае бачанне свету ніхто не адмяняў!

На думку Ганны, практыка падчас вучобы — зусім не фармальнасць, а рэальны шанц для студэнтаў заявіць пра сябе, набрацца пэўнага прафесійнага досведу і, калі пашанцуе, атрымаць першае рабочае месца. Таму ставіцца да яе легкадумна ні ў якім разе нельга. Тым больш што 58 % кампаній гатовыя браць да сябе студэнтаў для праходжання практыкі! «Чым раней вы пачняце будаваць сваю кар'еру, тым лепш, — раіць яна. — **Той, хто адкладвае пошукі першага рабочага месца да моманту атрымання дыплома, сур'ёзна памыляецца. Вы рызыкуеце спазніцца...»**

## МЕНШ ПРЫМЕТНІКАЎ І БОЛЬШ ДЗЕЯСЛОВАЎ

У спецыялістаў па падборы кадраў пацікавіліся, на якую інфармацыю яны звяртаюць увагу, калі чытаюць рэзюмэ кандыдатаў без досведу работы ў пэўнай прафесійнай вобласці. І высветлілася, што для іх важна, каб прэтэндэнт меў хоць бы нейкі працоўны досвед. Нават тая ж работа афіцыянтам дапамагае развіваць камунікатыўныя навыкі, наяўнасць якіх вельмі актуальная ў розных прафесійных абласцях, напрыклад, у сферы продажаў.

Ад практыкантаў наймальнікі чакаюць стараннасці (42 %), адказнасці (37 %), ініцыятыўнасці (25 %), паспяховага прымянення ведаў, атрыманых у навучальнай установе, на практыцы (20 %) і крэатыўнасці (5 %).

Увогуле, калі прааналізаваць кампетэнцыі і навыкі, якія найбольш часта сустракаюцца ў вакансіях, то сярод іх фігуруюць пісьменная мова, уменне весці дзелавую перапіску і перамовы, працаваць у камандзе, навыкі продажаў, аналітычныя навыкі, гатоўнасць навучацца, валоданне MS Office, аналітычныя навыкі, уменне знаходзіць агульную мову з партнёрам (кліентам), арганізацыйныя і прэзентацыйныя навыкі, тайм-менеджмент і вопыт публічных выступленняў. З асабістых якасцяў наймальнікі хацелі б бачыць у сваіх работніках адказнасць, камунікабельнасць, стараннасць, стрэсаўстойлівасць, акуратнасць, пунктуальнасць, самастойнасць, мэтанакіраванасць, добразычлівасць, кліентаарыентаванасць. **Важнае значэнне маюць таксама актыўная жыццёвая пазіцыя і амбіцыйнасць.**

І ўсё ж, што можна запісаць у рэзюмэ ў графу «Вопыт работы», калі працоўнага досведу пакуль няма? Карысная для наймальніка інфармацыяй можа аказацца, напрыклад, тэма дыплома, курсавой ці навуковай работы студэнта, калі яна, канешне, адпавядае вакансіі, досвед фрылансу, валанцёрства, стажыроўкі і практыкі, удзел студэнта ў цікавых праектах...

— Любы ваш досвед можа быць цікавы наймальніку, — кажа Ганна Шагун. — Абавязкова трэба ўказаць канкрэтную пасаду, на якую вы прэтэндуеце, напрыклад, «інжынер-тэхнолаг харчовай вытворчасці», «кіраўнік аддзела продажаў», «асістэнт аддзела маркетынгу», «стажор у аддзеле лагістыкі». Нельга пісаць у рэзюмэ, што вашай мэтай з'яўляецца «работа, якая дазволіць раскрыць патэнцыял», «стабільная высокааплатная работа», «работа ў паважанай стабільнай кампаніі» або «высокая пасада ў вобласці продажаў»...



Летась самая вялікая канкурэнцыя назіралася ў катэгорыі «старт кар'еры», дзе на адну вакансію прыпадала 26,5 рэзюмэ.

Калі прэтэндуеце на творчыя пасады (3D-дызайнер, мастак-аніматар і г. д.), выдзяляйцеся — да стандартнага рэзюмэ можна прыкласці альтэрнатыўнае. І не забывайцеся пра сваё партфоліа.

Стварайце рэзюмэ пад кожную пасаду і для кожнага наймальніка. Таму што нават да PR-спецыяліста ў розных кампаніях могуць быць розныя патрабаванні: для кагосьці самае важнае — уменне пісаць тэксты, а для іншага работадаўца важна, каб PR-спецыяліст быў гатовы даваць інтэрв'ю і гэтак далей. У залежнасці ад патрабаванняў наймальніка, трэба выносіць наперад менавіта тыя кампетэнцыі, якія ён хоча бачыць у першую чаргу.

**«Прыкладна трэцяя частка работадаўцаў ставяцца да людзей без досведу работы нейтральна».**

У рэзюмэ трэба пазбягаць апісальнасці (менш прыметнікаў і больш дзеясловаў), а таксама шаблонных фраз накшталт «маю вялікі вопыт работы», «добрыя арганізатарскія здольнасці», «уменне працаваць у камандзе». Сур'ёзным недахопам будзе і вялікі аб'ём інфармацыі, наяўнасць граматычных і пунктуацыйных памылак. Дакладна не варта тлумачыць патэнцыйнаму наймальніку прычыны звальнення з апошняга месца работы. У рэзюмэ трэба ўказваць толькі голыя факты. Дасягненні павінны падмацоўвацца лічбамі. Месцы работы (удзел у праектах), наймальнікі і пасады павінны прыводзіцца ў зваротным храналагічным парадку. А вось працяглыя перарывы ў рабоце трэба растлумачыць.

## «А ГЭТА Я... ПАД ПАЛЬМАЙ»

Якія яшчэ сур'ёзныя промахі дапускаюць складальнікі рэзюмэ?

— Пішуць не поўную назву ўстановы адукацыі, якую скончылі, а абрэвіятуру, у тэлефонным нумары для сувязі не ўказваюць код мабільнага аператара, а замест строгай фатаграфіі прымацоўваюць фота ў сонцаахоўных акулярах, пад навагоднай ёлкай, са стужкай «Выпускнік» ці нават сваё вясельнае фота. Магу прыгадаць і фота з мноствам прыступак на лесвіцы ў нейкім санаторыі, а на верхняй з іх стаіць кандыдат, — усміхаецца Ганна Шагун. — Ніхто не кажа, што патрабуецца прафесійная фотасесія. Дастаткова зрабіць звычайнае партрэтнае фота нават на свой гаджэт.

Трэба заўважыць, што на Захадзе ад фота ў рэзюмэ ўжо адмаўляюцца, бо знешнасць чалавека можа падсвядома паўплываць на выбар «рэкруцёраў». Аднак у нас усе звяртаюць увагу на яго, і рэзюмэ без фатаграфіі мае менш шанцаў быць заўважаным. Паколькі работадаўцы актыўна маніторац звесткі пра прэтэндэнта ў сацыяльных сетках, трэба абавязкова прывесці ў парадак сваю старонку, перагледзець фота, перачытаць статусы, лішняе выдаліць і папрасіць зрабіць тое ж самае сяброў, бо кампраметуючыя вас здымкі нярэдка знаходзяцца і на чужых старонках. Ці, як варыянт, можна ўстанавіць у сваім акаўнце настройкі прыватнасці.

— Наступны важны крок — сумоўе са спецыялістам па падборы кадраў. У прэтэндэнта, які хоча зацікавіць работадаўца, павінна быць высокая матывацыя і праславуты бляск у вачах. **Збярыце загадзя інфармацыю пра кампанію (арганізацыю), куды вы прыйшлі працаўладкоўвацца, — раіць эксперт, — каб у «рэкруцёра» не склалася ўражанне выпадковасці вашага візіту.** Некаторыя прыходзяць «проста паспрабаваць» і нічога не ведаюць пра каштоўнасці кампаніі — звычайна гэта непрыемна наймальніку. Прадстаўце свой вопыт як гісторыю прафесіянала — лагічную, звязную і кароткую. Працягласць вашай прамовы не павінна перавышаць пяці хвілін, яе можна на ўсялякі выпадак адрэпеціраваць дома. Падчас інтэрв'ю «кадравікі» могуць задаваць самыя нечаканыя (нават бязглуздыя ў вашым уяўленні) пытанні і сачыць за рэакцыяй кандыдата і яго дзеяннямі. Ім цікава, як вы будзеце выходзіць са становішча? Правяраецца таксама ваша гнуткасць, стрэсаўстойлівасць, магчымасць работы ў рэжыме хуткай змены задач. Адна з памылак саіскальнікаў — так званы ўваходны паток жаданняў, калі кандыдат падчас гутаркі цікавіцца толькі тым, што работа можа даць яму, і не гаворыць аб тым, чым ён можа быць карысны кампаніі. Другая — завышаныя патрабаванні, у прыватнасці, па заробках.

Падчас гутаркі з «рэкруцёрамі» трэба быць заўсёды лаяльным да свайго папярэдняга работадаўца, нельга выказвацца пра яго негатыўна, больш прадуктыўна казаць толькі добрае, напрыклад, што вы набылі на папярэднім рабочым месцы, чаму навучыліся — кожны наймальнік гэта ацэніць.

**«У рэзюмэ трэба пазбягаць апісальнасці, а таксама шаблонных фраз».**

— Добрыя спецыялісты будуць запатрабаваныя ва ўсе часы, а работадавец заўсёды будзе шукаць сярод кандыдатаў самых таленавітых, мэтанакіраваных і паспяховых, — упэўнена Ганна Шагун. — Практычна ўсім цяперашнім выпускнікам прыйдзецца за сваё жыццё пабудаваць некалькі кар'ер, мала хто будзе, як гэта было раней з іх бацькамі, на працягу дзесяцігоддзяў працаваць на адным месцы.

Яшчэ падчас вучобы варта пацікавіцца, якія кампетэнцыі патрэбны, каб атрымаць работу вашай мары, правесці інвентарызацыю сваіх уменняў, а яшчэ лепш — паспрабаваць трапіць на стажыроўку ва ўпадабаную кампанію...

І напрыканцы яшчэ адна парада: здараецца, што вас сур'ёзна зацікавіла нейкая вакансія і арганізацыя, вы адправілі туды сваё рэзюмэ, але зваротная сувязь адсутнічае. Вам не тэлефануюць і не запрашаюць на гутарку... У такім разе пазваніце самі, папрасіце, каб вас звязалі са спецыялістам па падборы персаналу. Ніхто не ведае, можа быць, вы зрабілі рассылку рэзюмэ па ўсіх кампаніях, а так вы прадэманструеце вашу асабістую зацікаўленасць. І, можа быць, яна будзе ацэнена...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Як скласці суправаджальны ліст да рэзюмэ? Што ў ім напісаць?

- кароткае прывітанне;
- хто я па прафесіі ці кім буду пасля заканчэння вучобы;
- чаму я хачу працаваць менавіта ў вас (матывы, прычыны зацікаўленасці ў гэтай вакансіі і канкрэтнай кампаніі);
- што я магу зрабіць для вас;
- што я зрабіў для папярэдніх работадаўцаў;
- падзякаваць за ўвагу і прапанаваць сустрэцца асабіста.

Трэці працоўны

## А які студатрад выбіраеш ты?

**У рамках аднайменнай рэспубліканскай акцыі па ўсёй краіне ў штабах працоўных спраў пярвічных арганізацый БРСМ устаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі штотыдзень будуць арганізаваны дні адчыненых дзвярэй па інфармаванні маладых людзей аб магчымасцях працаўладкавання ў перыяд трэцяга працоўнага семестра.**

У навучальных установах будуць разгорнуты экспазіцыі выставак, што папулярызуюць студатрадаўскі рух, арганізаваны рэкламныя кампаніі, якія будуць суправаджацца прэзентацыямі і творчымі нумарамі байцоў студэнцкіх атрадаў.

Кожнаму ахвотнаму патэнцыяльнаму ўдзельніку студатрадаўскага руху будзе дадзена магчымасць запоўніць анкету для работы ў атрадах і адзначыць свае перавагі па профілю (студэнцкі будаўнічы, сельскагаспадарчы, педагагічны, сэрвісны, медыцынскі, экалагічны, вытворчы атрад), аб'ект, віды работ, памер заработнай платы.

Правядзенне падобных мерапрыемстваў садзейнічае пашырэнню шэрагаў студатрадаўскага руху БРСМ, дапамагае яго арганізатарам своечасова каардынаваць запыты, якія паступілі, па працаўладкаванні па наяўных вакансіях як ад беларускіх, так і ад замежных наймальнікаў.

Нагадаем, на III Пленуме Цэнтральнага камітэта БРСМ 2019 год быў абвешчаны Годам студэнцкіх атрадаў. Трэці працоўны семестр традыцыйна стартуе ў пачатку мая. Аднак масава студэнты беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі і навучэнцы каледжаў прыступяць да работы ў складзе студэнцкіх атрадаў па ўсёй краіне і за яе межамі пасля заканчэння сесіі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

З нагоды

# Хто не чуў пра «Зубраня»?

## Там кожную змену атрад — як сям'я!




**Сёлета ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры святкуюць юбілей — 50 гадоў з дня заснавання. За гэты час змянілася многае — ад назвы да метадаў выхавання. Але захавалася тая атмасфера, за якую хлопцы і дзяўчаты, важатыя і супрацоўнікі так любяць «Зубраня».**

— Наша задача — стварыць умовы, якія былі б падобныя да сямейных, — кажа **дырэктар цэнтра Надзея АНУФРЫЕВА.** — Чым адрозніваецца «Зубраня» ад іншых устаноў? Канешне ж, атмасферай, адносінамі важатых і педагогаў з выхаванцамі, праграмамі развіцця. А яшчэ ў нас непаўторная архітэктура карпусоў, вялікая тэрыторыя, 40 катэгорый дзіцячай актыўнасці. Мы скіраваны на тое, каб не толькі навучыць дзяцей, але і аздаравіць. Для гэтага развіваем медыцынскі корпус, лабараторыю. Цяпер у нас можна выпраміць паставу, паправіць зрок. А харчаванне якое, а адпачынак!

За 50 гадоў у «Зубраняці» прынялі каля паўмільёна дзяцей. Калі напачатку існавання ўстановы туды прыязджала па 480 хлопчыкаў і дзяўчынак у змену, цяпер іх колькасць дасягнула 1200. 16 тысяч дзяцей штогод атрымліваюць тут шчырыя эмоцыі, дыхаюць свежым лясным паветрам, набываюць новых сяброў.

А адпачываць у «Зубраняці» прыязджаюць з больш як 40 краін, напрыклад, з Расіі, Японіі, Сірыі, Кітая, Індыі... Да выхаванцаў кожнай нацыі — свой падыход, але галоўная мэта — пазнаёміць дзяцей з нашай краінай, яе традыцыямі і гісторыяй.

Кавалачак «Зубраняці» назаўжды застаецца ў сэрцы кожнага, хто там пабываў. З цеплынёй успамінае сваю змену **Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК, кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі.** Яна трапіла ў Рэспубліканскі піянерскі лагер «Зубраня», як ён тады называўся, праз два гады пасля яго адкрыцця. Дагэтуль памятае тагачасных сяброў, важатых. І нават захоўвае сшытак з любімымі песнямі, якія калісьці запісала там. Сёлета Ларыса Емяльянчык з радасцю дапамагае арганізоўваць мерапрыемствы да 50-годдзя цэнтра.

Не забывае «Зубраня» і Іван Вабішчэвіч — беларуская «зорка», больш вядомы пад творчым псеўданімам Дзядзька Ваня. Ён часта прыязджае ў цэнтр як госць, каб парадаваць выхаванцаў сваімі песнямі, ды і проста адпачыць, паддацца настальгіі. «Як мінімум трэба было стаць артыстам, каб вяртацца ў «Зубраня», жартуе ён. Свае першыя крокі да прафесіі Іван рабіў менавіта ў лагеры: там упершыню выступіў на сцэне, удзельнічаў у конкурсах. І штодня вучыўся самастойнасці.



...50 гадоў — важная лічба ў жыцці цэнтра. Юбілей збіраюцца адзначыць з размахам. Зараз супрацоўнікаў — зрабіць свае мерапрыемствы яшчэ ярчэйшымі і арыгінальнейшымі. З запланаванага — устанавіць скульптурную групу "Наш важаты — таварыш і сябар", якая будзе складацца з трох фігур: хлопчыка, дзяўчынкі і важатага, правесці традыцыйныя фестывалі "Сяброўства без межаў", «Дзве краіны — адзін лёс», «Гуляюць дзеці — гуляем мы», выдаць кнігу пра цэнтр. Рыхтуецца і юбілейная праграма з немудрагелістай назвай «Нам — 50!», дзе можна будзе падзівіцца на лазернае шоу, атрымаць асалоду ад выступленняў дзіцячых творчых калектываў, паслухаць песні беларускіх знакамітасцяў, паўдзельнічаць у гульнях...

— Гэтыя мерапрыемствы дапамогуць аб'яднаць супрацоўнікаў і выхаванцаў, што працавалі і адпачывалі ў нас, — кажа дырэктар Надзея Ануфрыева, — дазволяць усім яшчэ раз вярнуцца ў тыя часы.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

Тое, што аб'ядноўвае

## Ганарыцца сваёй краінай

**БРСМ даў старт Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечанай Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.**

Мерапрыемствы акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!» адбудуцца ва ўсіх рэгіёнах краіны. Традыцыйна пуцёўку ў дарослае жыццё маладыя людзі атрымаюць з рук кіраўнікоў заканадаўчай і выканаўчай улады, грамадскіх дзеячаў і іншых заслужаных і аўтарытэтных людзей краіны.

Асаблівасцю патрыятычнага праекта БРСМ гэтага года стане ўдзел у ім 25-гадовых хлопцаў і дзяўчат — аднагодкаў Асноўнага Закона Беларусі, якім таксама будуць уручаны пашпарты грамадзяніна нашай краіны.

Усебеларуская акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!», ідэйным натхняльнікам якой з 2004 года выступае БРСМ, заняла годнае месца сярод рэспубліканскіх патрыятычных праектаў, яна карыстаецца папулярнасцю і падтрымкай з боку органаў дзяржаўнай улады. За гэты час праект аб'яднаў тысячы юнакоў і дзяўчат.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# МАЙСТАР З ВОСЬМАГА КЛАСА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Прыйшоўшы ў гурток па разьбе ў мясцовы Дом дзіцячай творчасці, хлопец не чакаў, што заняткі так яго захопяць. Цяпер увесь працэс стварэння вырабу ён ведае да драбніц.

— Спачатку трэба намаляваць трафарэт, каб увіць, як будзе выглядаць фігура, — расказвае Ягор. — Пасля — абвесці яго на дошцы ці бруску патрэбнага памеру. Адпілаваць лішняе, а затым, узяўшы стамеску, зрэзаць, закругліць у пэўных месцах і адшліфаваць. Важна рабіць гэта акуратна, сачыць за тым, каб не параніцца і нічога не сапсаваць...

Першы выраб — лапатку для ежы — майстраваць было цяжка: спатрэбілася аж два дні. Але з цягам часу справы пайшлі шпарчэй: некалькі гадзін — і фігура гатовая!

Летась Ягор наведваў майстэрню штодня. Пад апекай майстра Сяргея Клёса ён выразаў з дрэва машыны, жывёл, кухонныя прылады... Паступова, дзякуючы ўменням і распаведам настаўніка, сам натхніўся стаць сапраўдным разьбяром. «Сяргей Сяргеевіч умее ўсё! — кажа хлопец. — Ідэі, якія прыходзяць яму ў галаву, паўтарае да дробязяў. І малыя фігуры ўмее выразаць, і вялізныя сталы! Я таксама, як ён, хацеў бы зрабіць хатнюю мэблю. Але для гэтага яшчэ трэба шмат вучыцца».

Сёлета настаўнік змяніўся. Сяргей Клёс паехаў працаваць у Віцебск — і заняткаў стала менш. Але Ягор разьбу не кінуў. Да таго ж, запісаўся яшчэ і на маляванне, неабходнае для паступлення ў каледж. «Скончу дзявяты клас — і паеду да Сяргея Сяргеевіча вучыцца! — марыць падлетак. — Ён запрашаў».

Талент Ягора радуе маму і дзядулю. Дорачы ім свае вырабы, у адказ атрымлівае шчырую ўсмешку, падзяку і пахвалу: «Як прыгожа!», «Малайчына!». Сябры таксама просяць змайстраваць што-небудзь для іх. Ёсць ужо і замовы на продаж ад дарослых. «Трактары шмат часу не займаюць, таму іх не шкада аддаць і за невялікую цану», — усміхаецца Ягор, робячы маленькія крокі да вялікай мары — стаць разбяром-прафесіяналам.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

Нечакана!

# Квэст на... трактарах

**Незвычайны конкурс прайшоў упершыню ў Шчучыне (ды і ў краіне таксама) — спаборніцтва трактарыстаў-машыністаў, прысвечанае 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта гульня з удзелам маладых механізатараў уключала ў сябе элементы арыентавання, выкананне заданняў на эрудыцыю, кемлівасць і логіку.**

— Ідэю правядзення «Трактар-квэсту 2019» выказаў дырэктар раённага кінатэатра «Беларусь» Ігар Мікалаевіч Будзько — вялікі аматар тэхнікі і трактароў у прыватнасці. Ён звярнуўся з прапановай да кіраўніцтва райвыканкама, да праекта далучыўся наш Саюз моладзі, іншыя зацікаўленыя бакі, — расказала **першы сакратар Шчучынскага райкама БРСМ Анастасія ЦЫНГАЛЁВА.**

На старт выйшлі дзесяць механізатараў ва ўзросце ад 25 да 35 гадоў — восем ад сельскагаспадарчых прадпрыемстваў раёна, двое — ад ЖКГ. Кожны выступаў на сваёй тэхніцы.

Напачатку ўдзельнікі квэсту праявілі свае веды ў тэорыі (конкурснае заданне «Веды — сіла! Няведанне — штраф і пазбаўленне правоў!»), а пасля прэзентавалі сваіх «жалезных коней» у самым відовішчным этапе — парадзе трактароў па вуліцы Леніна. Пасля арганізаваная калона канкурсантаў пераехала на колішні ваенны аэрадром, дзе прайшла асноўная частка практычных спаборніцтваў.

Падчас аднаго з іх — «Майстэрства не пральеш!» («Васьмёрка задам», «Здымі вядро», «Пералі максімальную колькасць вады», «Вярні вядро назад») — удзельнікі пераліваі (на трактарах!) ваду з аднаго вядра ў другое. Далей было квэст-арыентаванне «Ведаю мэту — не бачу перашкод!», падчас якога канкурсантаў чакала траса ў 15 кіламетраў і арыентаванне па навігатару ў лесе. Тут удзельнікам спаборніцтваў давялося праяўляць кемлівасць і веданне гісторыі роднага краю.

Пераможцаў квэсту чакалі каштоўныя падарункі — ноўтбук, навігатар, відэарэгістратар і, канешне ж, дыпломы. Найлепшым механізатарам па выніках конкурсу былі прызнаны прадстаўнік ААТ «Шчучынаграпрадукт» Аляксандр Варона. Другое месца заваяваў механізатар з КСУП «Саўгас Вялікае Мажэйкава» Сяргей Раманаў. На трэцім месцы — работнік Шчучынскай ЖКГ Віталій Орлік. Дарэчы, арганізатары падумалі і пра балельшчыкаў. Для іх была асобная намінацыя — «Найлепшая група падтрымкі». Ёй былі прызнаны актывісты ААТ «Васілішкі».

«Трактар-квэст 2019» праходзіў ад ранку да самага вечара, сабраўшы шмат гледачоў, якія атрымалі незабыўныя эмоцыі. Дык ці будзе працяг?

— Мы ўжо думаем над гэтым, — прыадкрыла сакрэт Анастасія Цынгалёва. — У наступным годзе, магчыма, правядзём ужо не раённыя спаборніцтвы, а трактарны квэст паміж суседнімі раёнамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Хачу на подыум!*

# «У 30 — УЖО КАНЕЦ КАР'ЕРЫ»

## Як рыхтуюць будучых мадэляў

**«Мама паглядзела на мой рост і целасклад і сказала: ідзі ў мадэлі, — усміхаецца сімпатычны 15-гадовы юнак у клятчастай кашулі, пакуль яго аднагрупніцы адточваюць дэфіле. — А тату не падабаецца. Ён заўсёды спрабаваў адправіць мяне ў спартыўныя секцыі. Ну, я хаджу на баскетбол, але ўжо надакучыла».
Стаць мадэллю дагэтуль мараць многія падлеткі. Але ці лёгка трапіць у гэту сферу? Якія сёння стандарты прыгажосці? Ці ёсць на подыуме месца пышкам? Колькі можна зарабіць за паказ? Па адказы мы адправіліся ў Нацыянальную школу прыгажосці, дзе праходзяць курсы па прафесіі «Мадэль».**


Выкладчык дэфіле Аляксандра Платонава *(на пярэднім плане)*: «Правільная постаць адразу вылучае з натоўпу».

### У пашане — натуральная прыгажосць

Ахвотных скараць подыум і глянцавыя часопісы тут набіраюць два разы на год. Ёсць платныя і бюджэтныя месцы. На першыя могуць трапіць амаль усе, хто хоча навучыцца прыгожа хадзіць і пазіраваць для сябе: акрамя медыцынскіх, ніякіх патрабаванняў да кандыдатаў няма. На другія — строгі кастынг.

— Конкурс дастаткова вялікі, параўнальны з адборам у ВНУ. Мінімум чатыры чалавекі на месца прэтэндуюць, часам даходзіць і да шасці, — кажа **Дзмітрый ВРУБЛЕЎСКІ, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце школы.**

Здаецца, што хлопцам на бюджэт трапіць прасцей: ахвотных жа менш. «Але і попыт на мужчын-мадэляў не такі высокі, — заўважае Дзмітрый Врублеўскі. — Усё ж такі мода арыентуецца на жаночую частку насельніцтва. Не толькі ў нас, але і ў Еўропе мужчынскіх паказаў праходзіць мала, хлопцам складаней знайсці работу. Звычайна ў групе на бясплатным навучанні з 25 чалавек толькі пяць хлопцаў».

Крытэрыі пры адборы мадэляў класічныя: зграбная фігура, рост ад 175 сантыметраў для дзяўчат і ад 185 — для хлопцаў. Занадта высокім быць не пажадана: калекцыі шыюць па пэўных параметрах, і штаны ці пінжак не павінны быць для мадэлі кароткімі.

— У дзяўчат стандартны памер — 42—44. Але заўсёды ёсць папраўка на плюс-мінус сантыметр, бо пры адборы камісія звяртае ўвагу і на харызму. У кандыдата, які ўмее сябе падаць, мае нейкую іскрынку, болей шанцаў, — дзеліцца намеснік дырэктара.

Вітаецца натуральная прыгажосць. Валасы павінны быць нефарбаваныя і максімальна доўгія — дызайнерам патрэбна «база», каб можна было зрабіць мадэлі любую прычоску і стварыць гарманічны вобраз.

А што наконт кандыдатак памеру плюс-сайз? У школе адказваюць, што іх набіраюць толькі на платнае навучанне. Прычына простая — у краіне не так шмат запытаў на работу такіх мадэляў. У асноўным поўныя дзяўчаты працуюць у сегменце трыкатажнага адзення, а паколькі ў нас гэта галіна прадстаўлена пераважна прадпрыемствамі лёгкай прамысловасці, дзе прывыклі абыходзіцца сваімі сіламі, заказаў для іх мала. Вядома, праекты для нестандартных мадэляў ёсць, але яны адзінкавыя.

### Забудзьцеся на капрызы!

Курсы цягнуцца чатыры месяцы. Заняткі — тры разы на тыдзень. За прагулы могуць адлічыць. «У працэсе навучання павінна прывівацца дысцыпліна», — лічыць Дзмітрый Врублеўскі.

Прадметаў тут шмат: харэаграфія, візаж і цырульніцкае мастацтва, фотапластыка, стыль у адзенні, асновы псіхалогіі... У рабоце мадэлі можа спатрэбіцца ўсё. Адна з былых навучэнак, якая някдаўна працавала ў Мілане, расказвала, як сорамна ёй было, калі на прымерцы не пазнала вядомага дызайнера, хоць на занятках яго дакладна праходзілі.

На сцэнічным майстэрстве вучаць валодаць словам і працаваць са сваім целам — звяртаюць увагу на жэсты, міміку. Стараюцца разняволіць хлапцоў і дзяўчат.

— Самы галоўны бар'ер — іх падлеткавы ўзрост. У гэты перыяд вельмі важна меркаванне аднагодкаў, а многія тэатральныя практыкаванні вымушаюць цябе выглядаць, скажам так, не вельмі прывабна. Дзяўчаты і хлопцы баяцца паказацца непрыгожымі, — гаворыць **выкладчык па сцэнічным майстэрстве Аляксандр СТАСЕВІЧ.** — Няма практыкаванняў для падлеткаў больш смешных, чым артыкуляцыйная гімнастыка. Але яна вельмі карысная, каб умець кіраваць сваім голасам.

Праходзяць на курсах і этыкет. Разбіраюць, як паводзіць сябе за сталом, у грамадскіх месцах, пры знаёмстве і вітанні. Існуе нават этыкет мадэляў са сваім спісам правілаў і забарон. Так, калі дзяўчына ўжо пераапранулася для паказу, нельга садзіцца, есці і фарбавацца, каб не пашкодзіць убор.

— Мадэль павінна забыцца на капрызы. І не заяўляць, што не будзе нешта надзяваць на сябе, бо ёй не падабаецца, — адзначае Дзмітрый Врублеўскі. — Трэба прадэманстраваць любую рэч, як апошні піск моды, незалежна ад таго, што гэта.

На дыеце будучых манекеншчыц не садзяць — замест гэтага ім расказваюць пра здаровае харчаванне. Але дзяўчатам нагадваюць, што важна захоўваць свае параметры і, калі трэба, хадзіць у спартзалу, каб трымаць сябе ў форме.

### Завод пачакае

— З правай пайшлі! Раз, два, тры, чатыры. Выраўнялі плечы! Крок, разварот, — дае ўказанні групе **выкладчыца дэфіле Аляксандра ПЛАТОНАВА.**


Хлопцаў сярод навучэнцаў толькі пятая частка.

Навічкі падціскаюць вусны і нясмела паўтараюць рухі.

— Галоўныя памылкі — гэта сутуласць і сагнутыя калені. Таксама прысутнічае зацікнутасць, няўпэўненасць у сабе, — звяртае ўвагу педагог і дадае, што добрая пахадка важная не толькі для подыума, але і для жыцця — правільная постаць адразу вылучае цябе з натоўпу.

Каб навучыцца трымаць спіну роўна, мадэлі робяць «дамашняе заданне» — стойку каля сценкі з фіксацыяй пяці кропак: патыліцы, спіны, ягадзіц і пятак. Першы месяц у такой пазіцыі трэба штодзённа праводзіць па дзве хвіліны.

— А з кніжкай на галаве не ходзіце?

— Гэта практыкаванне ўжо крыху састарэла, — усміхаецца Аляксандра Платонава. — Ёсць шмат іншых — ёга, пілатэс. Можна, напрыклад, зафіксаваць рукі за спінай.

Мужчынская подыумная хада адрозніваецца ад жаночай. У дзяўчыны корпус крыху адхіляецца назад, а хлопец наадварот імкнецца плячыма наперад.

...**Ігнат САБКО** вывучае мікраэлектроніку ў політэхнічным каледжы. Паспрабаваць сябе ў якасці мадэлі вырашыў раптоўна.

— На кастынгу хваляваўся, думаў, наўрад ці прайду, — прызнаецца хлопец. — Вучыцца тут цікава, але многае не зразумела. Складана пакуль даецца фотапазіраванне: крыху скавана сябе адчуваю перад камерай.

Ігнат асвойвае азы мадэлінгу толькі месяц, але ўжо паспеў паўдзельнічаць у паказе. Кажа, па подыуме прайшоў упэўнена. А вось пасля дэфіле пачаў хвалявацца: ці добра выглядаў збоку?

— Рэакцыя аднакурснікаў на маё цяперашняе хобі? «Вай, нічога сабе, хутка зляціш куды-небудзь». Усе здзівіліся, але станоўча паставіліся.

Варыянт папрацаваць нейкі час мадэллю 17-гадовы хлопец разглядае: маўляў, пакуль малады, было б цікава. А ўжо потым можна і тэхнікам-тэхнолагам на завод пайсці.

Ёсць на курсах і тыя, хто ўжо пакаштаваў «мадэльнага хлеба». Напрыклад, у **адзінаццацікласніцы мінскай 43-й гімназіі Марыі СКРЫПКІНАЙ** за плячыма 30 паказаў. Усміхаецца, што на кішэнныя расходы ўдавалася зарабіць. У школу прыгажосці дзяўчына прыйшла, каб набрацца навыкаў у фотапазіраванні і завесці новыя знаёмствы.

— Вучобе ў гімназіі гэта не перашкаджае, спрабую сумяшчаць. Бал у мяне вышэйшы за сярэдні, — кажа Маша.

### За паказ — ад 40 рублёў

— Пасля курсаў мы бяром на кантракт толькі найлепшых. Гэта можа быць і 50, і 75 працэнтаў ад групы, — адзначае Дзмітрый Врублеўскі.

Перспектывы? У Беларусі мадэлінг, хутчэй, падпрацоўка. «У нас не так шмат паказаў, — тлумачыць намеснік дырэктара школы. — Дый заробкі ў сферы не самыя вялікія, каб можна было жыць толькі на іх. Колькі заплацяць за паказ, залежыць ад узроўню дызайнера, спонсараў. Ніжняя планка — 40 рублёў, верхняя можа дасягаць і некалькі соцень долараў. На заробак уплывае і вопыт мадэлі: калі гэта пераможца конкурсаў прыгажосці, яна працавала ў іншых краінах, то будзе атрымліваць больш».

Калі казаць пра работу за мяжой, то самы аб'ёмны рынак — гэта Азія, у першую чаргу Кітай. Чаму? Па-першае, інвестыцый у модную галіну на Усходзе ўкладаецца шмат, а таму заказаў хапае. Па-другое, беларуская знешнасць там запатрабаваная.

У Еўропе цэнтрамі прыцягнення мадэляў застаюцца Мілан, Парыж і Лондан.

— Там на кастынгах жорсткі адбор — па 70 чалавек стаяць у чэргах на паказ, куды патрэбна ўсяго некалькі чалавек. Камісіі дастаткова ўбачыць стомлены твар, няўпэўненасць у хадзе — і табе скажуць «да пабачэння», — канстатуе Дзмітрый Врублеўскі. — Напярэдадні тыдняў моды кастынгаў вельмі шмат, яны праходзяць у розных частках горада, і ўсюды трэба паспець. Калі не пашанцуе, дзяўчаты месяцамі могуць жыць без работы і атрымліваць толькі пражытковы мінімум ад агенцтва. Калі лянуешся, рызыкуеш вярнуцца дадому ні з чым.

Якія тыпажы цяпер больш запатрабаваныя, сказаць складана. Дызайнеры пастаянна ў пошуку новых твараў: мінуў той перыяд, калі мадэлі доўга трымаліся ў топе. А пенсійны ўзрост у гэтай галіне наступае гадоў на 20 раней.

— Ужо ў 30 звычайна кар'еры канец. Але ёсць і выключэнні. Усё залежыць ад дзяўчыны. Вялікую частку сродкаў, якія зарабляе мадэль, яна павінна ўкладваць у сябе — фітнес, касметалогія, веданне мовы, — каб максімальна даўжэй заставацца канкурэнтаздольнай.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**


На дыету дзяўчат не садзяць — расказваюць ім пра здаровае харчаванне і важнасць фізнагрузкі.

Занятак па душы

# «БРЭЙК-ДАНС — НЕ СПОРТ, А ТВОРЧАСЦЬ І ІМПРАВІЗАЦЫЯ»

**Гэты кірунак з'явіўся ў Нью-Ёрку яшчэ ў канцы 1960-х гадоў, але папулярны стаў толькі ў 80-я. Рух бі-бояў з кожным годам пашыраўся, праўда, у СССР ён развіваўся менш інтэнсіўна, чым у іншых краінах, і на гэта былі свае прычыны. Нягледзячы на з'яўленне ў апошні час мноства стыляў вулічнага танца, класіка хіп-хоп культуры — брэйк-данс — па-ранейшаму мае вельмі шмат прыхільнікаў. У 2018 годзе ён быў уключаны ў праграму Юнацкіх Алімпійскіх гульняў. Цікава, наколькі актыўна развіваецца гэты кірунак у Беларусі цяпер? Пра гэта мы даведаліся ў загадчыка аддзялення вулічнай культуры і спорту, педагога дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі сталіцы, старшыні Прэзідыума Рэспубліканская маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя брэйк-данса» Аляксандра ВОЙНАВА.**



***— Якія ўмовы створаны для танцораў сёння?***

— Да канца 1990-х брэйк-данс многімі ўспрымаўся ў штыкі. Казалі, што амерыканізуем нашу культуру. Тыя, хто быў захоплены гэтым танцавальным кірункам, вучыліся самастойна — па відэакасетах, прывезеных з-за мяжы. Цяпер у Беларусі брэйк-данс папулярны пераважна сярод падлеткаў і маленькіх дзяцей. Бацькі адводзяць малых у школу танца, пачынаючы з чатырох гадоў, а ўжо ў сем-восем гадоў дзіця ездзіць на сусветныя фіналы. Для бі-бояў і бі-гёрл дастаткова: гладкай падлогі і музычнага абсталявання. Бывае, што танцоры прывозяць «добрую падлогу» з сабой, гэта значыць, пераносную пляцоўку з лінолеумам, дыджэйскімі прыладамі і мікрафонамі.

***— Ці ёсць у бібоінгу абмежаванне па поле, узросце, фізічнай падрыхтоўцы?***

— Танцаваць могуць усе. Але падрыхтоўка да спаборніцтваў для хлопцаў і дзяўчат праходзіць па-рознаму. Хлопцы больш фізічна развітыя, таму ўключаюць у выступленне складаныя сілавыя манеўры, а дзяўчынкі грацыёзныя, яны часта выкарыстоўваюць элементы сальсы. У школах па брэйк-дансе як хлопчыкі, так і дзяўчынкі трэніруюцца разам. Гэта стварае здаровае канкурэнтнае асяроддзе.

Як і ў любой іншай справе, каб дамагчыся добрых вынікаў, трэба шмат працаваць. Выдатная фізічная падрыхтоўка — бонус для танцора. Як паказвае практыка, усё роўна, колькі гадоў чалавек танцуе, важна, наколькі ён матэнакіраваны і матываваны. Адночы прыйшоў да нас у школу, поўны, не пластычны дзевяцігадовы хлопчык. Цяпер яму 15 гадоў — гэта высокі, шыракаплечы юнак, які вельмі падабаецца дзяўчатам.

***— Ці ўсе, хто захапляецца гэтым кірункам, прагнуць славы, папулярнасці?***

— Усё залежыць ад амбіцый. Напрыклад, я заўсёды хацеў перамагчы на чэмпіянаце свету па брэйк-дансе. У якасці танцора не змог, затое выйграў у якасці трэнера: у 2017 годзе мае вучні сталі пераможцамі чэмпіяната свету, а за паўгода да гэтага — чэмпіёнамі Еўропы. Яны засвяціліся ў Галівудзе, дзякуючы чаму цяпер вядомыя на ўвесь свет. Лічу, што для ўласнага развіцця трэба выязджаць за межы краіны. Наша федэрацыя не толькі рыхтуе дзяцей да міжнародных спаборніцтваў, але і прывозіць у Беларусь замежных танцораў. Гэта абмен вопытам і карыснае ўзаемадзеянне. Нядаўна ў Мінску адбыўся першы чэмпіянат па брэйк-дансе ў Рэспубліцы Беларусь. У ім удзельнічала больш за 800 чалавек. Атмасфера была неверагодная!

***— Што дае танцорам Беларуская федэрацыя па брэйк-дансе?***

— Федэрацыя — гэта 17 школ па ўсёй краіне, якія аб'ядналіся для агульнай справы. Калі мы яе адкрывалі, была канкрэтная мэта — развіццё брэйкінга ў Беларусі. Сярод выкладчыкаў школ няма лішніх людзей, усе трэнеры — вопытныя дзеючыя танцоры. Многія з іх з'язджаюць у маленькія гарады і адкрываюць там школы, прыцягваюць да танцавальнага руху новых прыхільнікаў. Для нас брэйк-данс — гэта, найперш, не спорт, а творчасць. Не набор механічных рухаў, а імправізацыя, адлюстраванне настрою чалавека.

***— Для выступоўцаў важна валодаць рознымі стылямі?***

— Як паказваюць вынікі розных спаборніцтваў, у пашане ўніверсальныя танцоры. Тыя, хто міксуе стылі, элементы, імправізуе, эксперыментуе і, галоўнае, чуе музыку. Выпадкаў, калі



бі-бой крута танцуе, але не чуе біт, шмат. Прафесійныя брэйкдансеры просяць паставіць дыджэя іншы трэк, калі ён ім не падабаецца.

***— Вы пачыналі займацца брэйкінгам 20 гадоў таму. Адчуваеце розніцу паміж сучаснымі танцорамі і танцорамі таго часу?***

— Брэйк-данс увайшоў у маё жыццё, калі мне было 18 гадоў. Выкладчыкаў па гэтым кірунку танца ў Беларусі не было, былі толькі мы — хлопцы з вялікім запалам і жаданнем танцаваць. Таму эксперыментавалі, спрабавалі розныя варыянты выканання элементаў, з-за чаго разбівалі свае калені і плечы ў кроў. Цяпер танцоры-пачаткоўцы хутка вучацца. Некалькі гадоў узмоцненай падрыхтоўкі — і з'яўляюцца крутыя магчымасці для развіцця. Вядома, не кожны зможа доўгія гады займацца брэйкінгам. Кагосьці прызываюць у армію, у кагосьці з'яўляецца сям'я. Часта хлопцам-танцорам дзяўчаты не дазваляюць хадзіць на трэніроўкі, патрабуючы да сябе большай увагі. Я лічу, што гэта няправільна. Дзякуючы трэніроўкам у хлопцаў няма часу на ўсякую лухту, яны занятыя справай. Плюс да ўсяго развіваецца іх фізічная сіла.

***— А што развівае гэты стыль танца апроч яе?***

— Ён дапамагае арыентацыі ў прасторы, развіццю лідарскіх якасцей, дадае ўпэўненасці ў сабе. Бацькі прыводзяць дзяцей, каб пазбавіць іх ад комплексаў і дэпрэсіі. Акрамя таго, трэнеры паказваюць вучням, як правільна падаць. Нават калі танцор гуляе ў футбол, ён аўтаматычна пазбягае траўмаў.

***— Сочыце за выступленнямі іншых танцораў, параўноўваеце са сваім узроўнем падрыхтоўкі?***

— Асабіста я гэтага не раблю, таму што на падсвядомым узроўні чалавек капіруе паводзіны, элементы танца. Аналізуем толькі ўласныя выступленні, глядзім на памылкі, робім высновы і выпраўляем іх.

***— Як вызначыцца з выбарам школы пачаткоўцу?***

— Лепш ісці туды, дзе выкладаюць вопытныя педагогі-практыкі. Школа — гэта не толькі падрыхтоўка да спаборніцтваў; а традыцыі, лагеры, выязныя мерапрыемствы, зборы, работа з бацькамі, падтрымка. Бацькам, якія хочуць аддаць дзіця ў школу па брэйк-дансе, раю кіравацца не тэрытарыяльным прынцыпам (бліжэй да дому), а рабіць стаўку на прафесіяналізм выкладчыкаў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

А тым часам

## Датанцавацца да... алімпійскага золата

**Аргкамітэт Алімпійскіх гульняў — 2024 у Парыжы прапанаваў унесці ў праграму спаборніцтваў брэйк-данс, паведаміла CNN.**

На думку прадстаўнікоў аргкамітэта, брэйк-данс — гэта гарадскі спорт, універсальны і надзвычай папулярны сярод больш чым аднаго мільёна хлопцаў і дзяўчат у Францыі, таму ён мае права ўвайсці ў праграму гульняў.

Прадстаўнік МАК расказаў CNN, што камітэту спадабалася гэтая прапанова, паколькі яна адпавядае актуальным на сённяшні дзень мэтам па амаладжэнні Алімпіяды. «Прапанова аргкамітэта Алімпійскіх гульняў — 2024 шмат у чым адпавядае рэформам Алімпіяды 2020 года, якая імкнецца зрабіць праграму спаборніцтваў гендарна збалансаванай, больш арыентаванай на моладзь і больш гарадской», — гаворыцца ў заяве МАК.

Як паведамляе ТАСС, у ліпені 2018 года МАК прыняў рашэнне ўключыць пяць новых відаў спорту ў праграму Гульняў 2020 года ў Токіа: бейсбол/сафтбол, каратэ, сёрфінг, скалалажанне і скейтбордынг. Пры гэтым было агаворана, што гэты спіс спаборніцтваў будзе актуальны выключна для Алімпіяды-2020, а аргкамітэты наступных летніх Алімпіяд маюць права таксама фарміраваць спаборніцкую праграму.

